Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

МАЙ 31 1933 г.
№ 118 (4662)
Год выданьня XVI

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Перад чысткай.

Даклад стар. Цэнтральнай камісіі па чысткі КП(б)Б тав. АНЦІПАВА на сходзе ўсебеларускага партактыву 28 мая (3 стар.).

Перадавыя раёны — вазьмеце на сацыялістычны буксір адстаючыя! (2 стар.).

С. ДАВІДОВІЧ — За стварэньне высокаякаснай дзіцячай кніжкі. (2 стар.).

ВОПЫТ КАЛГАСНАЙ ЯЧЭЙКІ (2 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Заміраньне цяжкай прамысловасьці ў Польшчы (4 стар.).

Канфэрэнцыя—дапамогі ахвярам германскага фашызму (4 стар.).

Дзяржавы Малой Антанты пратэстуюць супроць рэвізіі мірных дагавораў (4 стар.).

НІКАЛАЕЎ — Праца настаўніка павінна аплачвацца па якасьці (4 стар.).

Трактарны гігант на рубяжы Эўропы і Азіі (2 стар.).

Перад чысткай

КП(б)Б напярэдадні чысткі. Партыйнымі арганізацыямі праведзена значная работа па растлумачэньні сярод членаў і кандыдатаў партыі і беспартыйных задач чысткі. Праведзена значная работа па актывізацыі членаў КП(б)Б, па ўзьнятцці іх вядучай ролі. І ўсё-ж прызнаць праведзеную пад рыхтоўчую работу здавальняючай нельга.

Калі ва многіх арганізацыях праведзена здавальняючая растлумачальная работа сярод членаў і кандыдатаў партыі, то нельга лічыць выстарчальнай работу, праведзеную сярод беспартыйных працоўных мас. Калі на адкрытых партыйных сходах прысутнічалі беспартыйныя, то гэта яшчэ ня значыць, што растлумачальнай работай ахоплены ўсе беспартыйныя рабочыя. Партыйна-масавая і растлумачальная работа на чысткі партыі яшчэ не дайшла да цэху, да брыгады. Для таго, каб мэты і задачы чысткі дайшлі да кожнага рабочага і калгасьніка, неабходна правесьці групавыя і індывідуальныя гутаркі ў кожнай брыгадзе і зьвяне.

Асабліва сур'ёзную ўвагу трэба аддаць якасьці растлумачальнай работы з тым, каб рабочы і калгасьнік правільна зразумеў мэты і задачы чысткі. У групавой і індывідуальнай гутарцы трэба гаварыць ня толькі аб агульных задачах чысткі, але і аб тых практычных задачах, якія стаяць перад данай групай, брыгадай, зьвяном, узьнімаючы гэтыя практычныя задачы на высокі палітычны ўзровень. З кожнай гутаркі павінны вынікаць поўныя самаабавязацельствы рабочых і калгасьнікаў, у першую чаргу членаў і кандыдатаў партыі, якія павінны будуць даказаць уменьне весьці за сабой беспартыйных у барацьбе за выкананьне ўзятых на сябе абавязацельстваў.

Ператварыць чыстку партыі ў магутны ўзгар выкананьня бягучых гаспадарча-палітычных задач—гэта адзін з рашаючых момантаў ва ўсёй нашай масава-растлумачальнай рабоце.

У радзе партыйных арганізацый да гэтага часу яшчэ не разгорнута растлумачэньне задач чысткі сярод шырокіх мас членаў і кандыдатаў партыі (Бягомля, Вузда, Гарадок, Горкі і інш.). У гэтых арганізацыях пастанова ЦК і ЦКК аб чысткі не стварыла яшчэ таго ўздыму партыйнага жыцьця, які мы назіраем у арганізацыях, якія добра падрыхтаваліся да чысткі. Некаторыя сакратары ячэек Гарадоцкага, Горацкага і іншых раёнаў лічаць, што ім няма калі займацца падрыхтоўкай да чысткі. Трэба, каб яны, ранней скончыць сяўбу. Палітычная сьлепата і непісьменнасьць гэтых гора-кіраўнікоў зусім відавочна.

Некаторыя райкомы райКК (Гарадок, Вузда) не праўяляюць належнай цвёрдасьці і настойлівасьці ў кіраўніцтве падрыхтоўкай да чысткі. Гэтыя райкомы і райКК лічаць, што іх кіраўніцтва канчаецца прыняцьцем пастановы аб падрыхтоўцы да чысткі. Яны глыбока памыляюцца, бо ўсякая добрая пастанова нічога ня варта, калі не правяраць яе выкананьня. Але правяраць яшчэ мала. Трэба штодзённа кіраваць, дапамагаць ячэйкам у разгортваньні падрыхтоўчай работы. М. і ГК і ГКК, прыняўшы пастанову, арганізавалі праверку выкананьня гэтай пастановы, правялі нараду сакратароў ячэек і амаль з кожным сакратаром ячэйкі ў паасобку мелі гутарку аб тым, як лепш арганізаваць падрыхтоўку да чысткі.

У ячэйках Менскай, Гомельскай, Бабруйскай, Аршанскай партарганізацый разгарнулі работу абсьледацельскія і самаправяраючыя брыгады. Гэтыя брыгады выяўляюць недахопы ў рабоце ячэек і асобных камуністаў, дапамагаюць у зьнішчэньні гэтых недахопаў. Але гэтыя самаправяраючыя брыгады ня ўсюды ў выстарчальнай меры інструктуюцца, а таму некаторыя з іх сьлізгаюць па паверхні. Так, напрыклад, тав. Мишкін, абсьледаўваны Мальлеўскую ячэйку (Бабруйскі раён), не ўвайшоў у сутнасьць работы ячэйкі і напісаў вывады пад дыктоўку сакратара ячэйкі тав. Марозава. А апошні не пашкадаваў фарбаў, каб паказаць сваю ячэйку добрай.

Надзвычай дрэнна стаіць справа з улікам членаў і кандыдатаў партыі. Нядаўна ў «Праўдзе» паведамлялася, што ў Віцебскай партарганізацыі было выяўлена 800 «мёртвых душ». У «Зьвязьдзе» ад 26 мая паведамлялася, што ў Гарадку «зьнікла» 100 членаў і кандыдатаў партыі, «зьніклі» цэлыя тры ячэйкі. На «Камунарцы» (Менск) са 100 членаў і кандыдатаў партыі 20 аказаліся «мёртвымі душамі».

Гэтыя факты гавораць ня толькі аб дрэнным уліку, але і аб дрэнным веданьні членаў і кандыдатаў партыі парткомамі, бюро ячэек і парторгамі. Гаркомы і райкомы павінны дабіцца таго, каб да пачатку чысткі была выяўлена сапраўдная колькасьць членаў і кандыдатаў партыі кожнай парт'ячэйкай, кожным парткалектывам. Правільны ўлік камуністаў—ня тэхнічная справа. Правільны і дакладны ўлік мае вялікае значэньне з пункту гледжаньня вызначэньня дынамікі росту тэй ці іншай арганізацыі, уплыву ня на асобныя пласты працоўных і веданьня твару асобных камуністаў. Зусім ясна, наколькі ўсё гэта важна, асабліва цяпер, калі прыступаем да чысткі і праверкі радоў партыі.

Але гэтым яшчэ ня вычэрпваецца пытаньне аб «мёртвых душах». Ёсьць «мёртвыя душы», якія нікуды не ад'язджалі, не паміралі, з партыі не выключаліся, працуюць там, дзе яны лічацца на вучоце. А сталі яны «мёртвымі» таму, што адарваліся ад партыі, ад партыйнай ячэйкі. Прычым адарваліся не таму, што ня згодны з лініяй і палітыкай партыі. Неадварот, многія з іх добрыя ўдарнікі, сапраўдныя энтузіясты на вытворчасьці, але іх не заўважвалі, пра іх забыліся, іх ня выхоўвалі. На добрускай фабрыцы «Герой працы», напрыклад, сярод такіх аказаліся рабочыя і работніцы з 20 і 30-гадовым вытворчым стажам. Многія з іх маюць нават 5,6 і 7 - гадовы партыйны стаж.

Гэтыя старыя рабочыя ўступалі ў партыю, шчыра жадаючы працаваць разам з ёю, выхоўвацца ў ёй. Але яны ня сустрэлі падтрыманьня, іх ня ўцягвалі ў работу, ім не давалі задань, іх ня ўцягвалі ў палітшколы, ня ўказвалі на іх хібы і памылкі. Натуральна, што такія рабочыя паступова пачалі адрывацца ад партыі, перасталі наведваць сходы, плаціць членскія ўзносы і г. д.

У падрыхтоўчай рабоце да чысткі надзвычай важнае значэньне мае дача пісьмовых характарыстык на членаў і кандыдатаў партыі. Між тым, ва многіх партыйных арганізацыях гэта справа стаіць дрэнна. Характарыстыкі яшчэ ня ўсюды напісаны, а ў некаторых ячэйках яны складзены так, што не паказваюць сапраўднага партыйнага твару характарызуемага. Пішуць, напрыклад: «ударнік на вытворчасьці, прамфінпляну ня выконвае», або: «дысцыплінаваны член партыі, 6 месяцаў ня плаціць членскіх узносаў» і г. д. Часта даюць характарыстыкі з тым, каб яны паслужылі для камісій па чысткі сапраўдным матар'ялам, характарызуючым як ячэйку ў цэлым, так і асобных камуністаў.

Падрыхтоўка да чысткі ёсьць арганічная частка ўсёй работы па правядзеньні чысткі. Якасьць самой чысткі будзе ў значнай ступені залежыць ад якасьці падрыхтоўкі да яе. Таму на падрыхтоўку трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу.

Даклад т. Анціпава, які мы сёньня друкуем, з усёй паўнатой растлумачвае вялізарнейшыя задачы на ачысткі КП(б)Б ад усяго чужога, ад усіх элементаў, якія разлажыліся, прысмакталіся да партыі. Гэты даклад павінен стаць здабыткам кожнага члена і кандыдата партыі, здабыткам шырокіх мас працоўных. Сапраўды па-бальшавіцку падрыхтавацца да чысткі, выкарыстаць кожны дзень, што застаўся — неадкладная задача кожнай арганізацыі.

Крычаў спаборнічае з Шумяцкім раёнам Заходняй вобласьці

КРЫЧАЎ. (Па тэлеграфу).

У Крычаў прыбыла камісія ЦК КП(б)Б па правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва з Заходняй вобласьцю на лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы, поліва і ўборкі.

Бюро Крычаўскага РК КП(б)Б на пасяджэньні пастанавіла ўключыць усю партыйную, савецкую, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, калгасьнікаў і адпаасобнікаў у сацыялістычнае спаборніцтва з **Шумяцкім** раёнам Заходняй вобласьці.

У той-жа дзень на ўсіх калгасах у вытворчых брыгадах адбыліся 15-мінутныя мітынгі, прысьвечаныя разгортаньню спаборніцтва з Шумяцкім раёнам. Такія-ж мітынгі адбыліся і ў 10-дворных адпаасобнікаў.

Вечарам на адкрытых сходах ячэек з шырокім удзелам калгасьнікаў і адпаасобнікаў абмяркоўваліся ўмовы сацыялістычнага спаборніцтва, заключаныя паміж калгасьнікамі БССР і Заходняй вобласьці.

Раённая газэта «Сацыялістычны шлях» выпусьціла экстраны выпуск, прысьвечаны спаборніцтву.

Камісія ЦК КП(б)Б разам з прадстаўніком Крычаўскага райкому выехала ў Шумяцкі раён.

* *

КРЫЧАЎ.

Дэлегацыя Заходняй вобласьці на чале з загадчыкам сэктару друку абласкому тав. **Лібэрманам** прыбыла ў Крычаўскі раён для азнаямленьня з ходам сацыялістычнага спаборніцтва. 30-га мая дэлегацыя Заходняй вобласьці выехала ў Чэрыкаў.

Сімховіч.

ЛЕН ЗАСЯВАЕЦЦА ЗУСІМ МАРУДНА

Рашуча пакончыць з ганебнейшым адставаньнем раёнаў ільнаводчай зоны

ХОД СЯЎБЫ ІЛЬНУ ПА ПЯЦІДНЕЎКАХ У ГЭКТАРАХ

ЗА 3-ю ПЯЦІДНЕЎКУ МАЯ	ЗА 4-ю ПЯЦІДНЕЎКУ МАЯ	ЗА 5-ю ПЯЦІДНЕЎКУ МАЯ
41.284	70.220	41.833

ІЛЬНАВОДЧЫЯ МТС ЗАЦЯГВАЮЦЬ СЯЎБУ

Тэмпы сяўбы ільну па БССР за апошнюю пяціднеўку мая рэзка **ЗЬНІЗІЛІСЯ.** Калі за чацьвертую пяціднеўку па рэспубліцы было засеяна 70.220 га ільну, дык за пятую пяціднеўку засеяна ўсяго 41.833 га — **НА 28.337 ГА МЕНШ.**

Асабліва адсталі раёны паўночна-ільнаводчай зоны. За апошнія пяць дзён — з 20 па 25 мая — гэтыя раёны засеялі на **10.000 ГА МЕНШ,** чым за папярэднюю пяціднеўку.

Ільнаводчыя раёны маюць усе ўмовы для таго, каб сваячасова закончыць сяўбу ільну. Яны куды лепш забясьпечаны трактарамі і складанымі машынамі. У кожным ільнаводчым раёне ёсьць МТС.

Адным з асноўных прычын адставаньня ільнаводчых раёнаў зьяўляецца зусім **НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЯ РАБОТА ТРАКТАРНАГА ПАРКУ.** Некалькі лічбаў. У той час, як калгасы ільнаводчых МТС выканалі плян сяўбы на 60,1 проц., дык калгасы, якія не абслугоўваюцца МТС, выканалі плян сяўбы на **61,2** проц.

Асабліва гэта адставаньне выпукліецца на практыцы работы паасобных раёнаў. У **СУРАСКІМ** раёне плян сяўбы яравых выкапан на **50** проц., а па калгасах раённай МТС — усяго на **37,2** проц.

У **РАСОНСКІМ** раёне калгасы, якія не абслугоўваюцца МТС, засеялі **63,9** проц. яравога кліну, а калгасы МТС — толькі **44,9** проц.

Трактарны парк у цэлым радзе машына-трактарных станцый ільнаводчай зоны скарыстоўваецца зусім невыстарчальна. Даволі ўказаць, што па калгасах **СІРОЦІНСКАЙ** МТС жывой цягавай сілай узарана **2.250** гэктар, а трактарамі толькі... **145.**

Сіроцінская МТС сваёй ганебнай работай ярка паказвае, у чым сапраўдныя прычыны адставаньня ільнаводчых машына-трактарных станцый.

У Сіроцінскай МТС трактарны парк большую частку рабочага часу стаіць. Расстаноўка сіл няправільная, а часам проста шкодніцкая. Спачатку сяўбы трактары насылаліся ў тыя калгасы, дзе ворыва і сяўбы нельга было пачынаць.

У калгасе «Бязбожнік», напрыклад, 5 трактараў прастаялі цэлых два тыдні бяз ўсякай работы. Палі калгасу былі заліты вадой і машыны бук савалі. У той-жа час на тым-жа самым вучастку ў суседніх калгасах — «Чырвоны маяк», «Чырвоная зорка», «Праца» і г. д. глеба падсохла і ворыва можна было праводзіць поўным тэмпам.

Трактары ў МТС абвызічаны. Невядома, хто і за што адказвае. Адсюль шматлікія паломкі і прастоі.

Дырэкцыя МТС амаль ніколі ня бывае на вучастках. Дырэктар станцыі **БАЛЦІН,** у прыватнасьці, са свайго габінэту ня вылазіць. Кіраўнікі МТС ня маюць ніякага ўяўленьня, як праходзіць ворыва і сяўба на вытворчых вучастках. Упаўнаважаны Ільнатрактарацэнтру **ЛАМАЧОЎ** зусім не рэагуе на ўсе гэтыя агіднейшыя факты. Ён ужо два тыдні сядзіць у Сіроцінскай МТС, а практычнай дапамогі ад яго ні на грош.

Далейшае адставаньне ільнаводчых МТС зусім нецярпіма. Практыка Шклоўскага раёну, які першым у рэспубліцы поўнасьцю засеяў увесь лён, практыка перадавых МТС, якія цалкам выканалі пляны па сяўбе ільну — пераканаўчы довад, што лён можа і павінен быць неадкладна і поўнасьцю засеян.

ГАРАДОЦКІ, СІРОЦІНСКІ, АСЬВЕЙСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ раёны — найбольш адстаючыя раёны ільнаводчай зоны і павінны, нарэшце, пакончыць са сваім злачынным адставаньнем.

Ільнаводчыя МТС абавязаны неадкладна і поўнасьцю завяршыць сяўбу, паказаўшы прыклад у барацьбе за лён!

ЗОР.



Калгас «Новыя Гараны» (Полацак). Запраўка сявяркі перад выхадам у поле.

ПЕРШЫМІ Ў ВОБЛАСЬЦІ

СМАЛЕНСК, 28.

Першымі ў Заходняй вобласьці закончылі сяўбу ільну Вяземскі і Ржэўскі раёны.

Вяземскі раён зсеяў 20.000 гэктараў ільну. Па сваёй пасеўнай плошчы гэтыя раёны зьяўляюцца буйнейшымі ў Заходняй вобласьці.

ПРАВЯРАЕЦЦА КОЖНАЯ ШРУБКА

Калгас імя АДПУ (Менішчына) да 7-га мая скончыў сяўбу яравых. Зараз калгас канчае пасадку гародніны, якая займае ў агульным пляне даволі вялікае месца. Садзяць гуркі, памідоры, капусту.

Яравыя засеялі добраадсартаваным, пракышчаным насеньнем. Сеялі сявяркай, зямлю апрацоўвалі як найлепш і вынікі добрыя. Зялёныя ўсходы аўса, ячменю, пшаніцы пакрылі калгасныя палі. Усходы роўныя, яны шпарка цягнуцца ўверх.

Частка калгасьнікаў пераключылася на падрыхтоўку да ўборкі і будаўнічыя работы. У рымарнай і кавальскай майстэрнях ідзе праверка інвэнтару да ўборкі. Папраўляюцца шрубкі ў жняярках, касілках, граблях.

Калгасам пядаўна куплены 4 новых жняяркі. На кожную брыгаду прыходзіцца па 2 жняяркі, па 1 касілцы і па адных конных граблях.

— Машыны сёлета зусім танныя, — кажа старшыня калгасу тав. **Казлоў.** Сявярка каштуе 276 руб., а жняярка—224 руб. Куплены інвэнтар на такой цане для нас вельмі лёгка.

— Як мы справімся з уборачнай?

— На ўборку сенажаці мы патрацім 14 дзён,— адказвае Казлоў. Жыта ўбіраем за тры дні. На нашых конях адной жняяркай убіраецца за дзень 7 га. Будзе працаваць 6 жняярак. Мы не дапусьцім, каб на полі застаўся хоць адзін сноп.

Коні ў калгасе зараз адпачываюць, набіраюцца сіл

М. Ц.

ЗЬМІРЫЛІСЯ З КУЛАЦКІМ САБАТАЖАМ

ГАРАДОК, 27. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Сумную вядомасьць набыў сабе **ГАРАДОЦКІ** раён. За ганебныя тэмпы сяўбы Гарадок ужо амаль 20 дзён сядзіць на чорнай дошцы.

Да 25 мая раённы плян сяўбы яравых выкапан толькі на **31,1 ПРОЦ.**

Няма ніякага апраўданьня такім ні куды ня вартым тэмпам сяўбы. У тым-жа самым Гарадоцкім раёне паасобныя калгасы ўжо даўно засеялі яравыя, у тым ліку і **АСНОЎНУЮ КУЛЬТУРУ — ЛЕН.** Калгас **«ТРАКТАР»,** напрыклад, засеяў увесь лён і збожжавыя яшчэ да 20 мая.

Ёсьць усе магчымасьці сваячасова скончыць сяўбу яравых. Гэтыя магчымасьці і вопыт перадавых калгасаў, аднак, **НЕ СКАРЫСТАНЫ.**

Стаўка на самацёк, прымірэнцтва да кулацкага сабатажу, падмена масавай работы голым адміністраваньнем — вось у чым прычыны ганебнейшага адставаньня Гарадоцкага раёну ў сяўбе.

Вазьмеце рашаючы ў раёне па ільну **ВАЙХАНСКІ** сельсавет.

Кулацкі сабатаж у часе ільназагатовак тут быў асабліва сур'ёзным. Клясавы вораг і яго агентура не атрымалі патрэбнага адпору. Сельсавет так і ня выканаў поўнасьцю ільназагатоўчага пляну.

Патрэбныя вывады адсюль ня былі зроблены. Недабіты кулак, нявыкрыты сабатажнік вялі падрыўную работу, а сельсавет і ячэйка, так сказаць, нічога ня бачылі...

Кулак, пралезшы ў калгасы, шалёна імкнецца сарваць сваячасовы засеў ільну.

Калгас імя Крупскай да 25 мая не засеяў ні аднаго гэктара ільну. У калгасе імя Леніна засеяна толькі 8,54 га замест пляновых 45.

Калгас «Першы май» засеяў усяго 15,5 га ільну і гэта пры пляне ў 65 гэктараў.

Адпаасобнікі павінны засеяць 680 гэктараў, а засеялі толькі 67,33 га — менш 10 проц. пляну. Недалёка пайшлі і калгасы. Яны засеялі ўсяго 48,7 га — 17 проц. задаўненьня па ільну.

Ні ячэйка, ні сельсавет, літаральна, нічога не зрабілі, каб пакончыць з такім агідным становішчам. Няма ніякага кіраўніцтва сяўбой, ніякай масавай работы, ніякай барацьбы з кулацкім сабатажам.

ЗІЗІКАЎ (сакратар партыйнай ячэйкі) і **АПАНАСЁНАК** (старшыня сельсавету) ня вылазяць са сваіх габінэтаў. Сапраўднае апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой падменена крыкам, камандаваньнем, голым адміністраваньнем.

Зізікаў толькі тое і робіць, што направа і налева патражае арыштам, крычыць, камандуе, залахвае.

Брыгадзіры, старшыні калгасаў адклікаюцца з поля (і гэта ў самы гарачы час сяўбы) для спэцыяльных гутарак у сельсавеце.

Што-ж яны там сустракаюць? Практычную дапамогу, указаньне, дзелавую дырэктыву, нараду, як выправіць памылкі? Нічога падобнага. Зізікаў, сабраўшы людзей, пачынае лаяцца, крычаць, патражаць і г. д. Так заўсёды: скліча, залахвае і адсылае назад.

Сярод працоўных адпаасобнікаў таксама не праводзіцца ніякай масава-арганізацыйнай работы. Практыкуюцца тыя-ж мэтады «лякацкага адміністраваньня», галавацяпскага камандаваньня.

Сельсавет менш за ўсё клапаціцца аб тым, што сяўба пад патрозай поўнага зрыву. Сельсаветчыкі толькі з вялікім энтузіязмам гонацца за толькімі процантамі калектывізацыі. Калгас арганізуецца за калгасам. Прымаюць усіх, **БЯЗ УСЯКАГА РАЗБОРУ.** Дзьверы калгасаў шырока адчынены для яўных сабатажнікаў сяўбы, якія злачынна разбазарылі ўсё сваё насеньне.

Так у сельсавеце і робяць. Людзі разбазараць, або ўтопіць сваё насеньне, а потым іх арганізуюць у калгасы і ў раён ляцяць бясконцыя заявы: дайце насеньне...

З лёгкай рукі сельсаветчыкаў у Вайханах таксама чынам ужо арганізаваны пяць новых «безпасенных» калгасаў.

Зізікава не задавальняе дасягнутая «перамога». Ён шыхмае пастанову — арганізаваць яшчэ адзін — шосты калгас, а потым... патрабаваць ад раёну насеньне...

Паўрад ці патрэбны камэнтары да гэтых фактаў!?...

* * *

Няўжо-ж раённыя арганізацыі ня ведаюць пра становішча ў Вайханах. Няўжо-ж яны ня бачаць, што ў сельсавет і ячэйку пралезла кулацкая аген тура.

ВЕДАЮЦЬ. БАЧАЦЬ. Нават больш, — прымаюць поўныя меры. Старшыня сельсавету Апанасёнак, напрыклад, ужо **ВЫКЛЮЧАН З ПАРТЫІ.**

Але ў Гарадку... арыгінальныя людзі (мы маем на ўвазе райком РКК і райвыканком). Выключыўшы з партыі Апанасёнка, яму даверылі даручылі па-ранейшаму... кіраваць сельсаветам.

Апанасёнак яшчэ і цяпер, па сёньнішні дзень, старшыня Вайханскага сельсавету.

І Зізікаў, і Апанасёнак па-ранейшаму, прыбраўшы да сваіх рук парт'ячэйку і сельсавет, злачынна зрываюць сяўбу.

Аб чым усё-ж думае Гарадоцкі райком?!

М.

ПРА ПОЛІВА ЗАБЫЛІ

ГОМЕЛЬ.

Многія калгасы і сельсаветы Гомельшчыны ўжо скончылі сяўбу. Час пачынаць поліва. Між тым Гомельскі гарэз не сьпяшаецца.

Загадчык гарэза тав. **Гарбузоў** адкрыта прызнаецца, што па месцы — калгасам і сельсаветам ніякіх дырэктыў аб поліве і падрыхтоўцы да ўборкі ня далі. Аб тым, як ідзе поліва ў раёне, у гарэза ня ведаюць.

Работнікі гарэза лічаць, што паколькі ў кожным калгасе нібыта вызначаны мерапрыемствы па павышэньні ўраджайнасьці, аб поліве клапаціцца няма чаго.

Як калгасы падрыхтаваны да ўборкі, у якім становішчы знаходзіцца цягавая сіла, ці адрамантован інвэнтар, — у гарэза таксама ня ведаюць. Аграном Дзяміцьенка абмежоўваўся тым, што склаў плян рамонту інвэнтару. Але як праходзіць рамонт — гэта яго мала цікавіць.

Партыйная-ж ячэйка ні разу не абмяркоўвала пытаньня падрыхтоўкі да поліва і ўборкі.

Іофэ.

Чорная дошка

Пастановай камісіі ЦК КП(б)Б на спаборніцтве з Заходняй вобласьцю за ганебныя тэмпы сяўбы занесены на чорную дошку і кандыдатамі на чорную дошку наступныя раёны:

СІРОЦІН — 27,7 проц. Сакратар РК КП(б)Б МІРАНЕНКА, старшыня РВК ЦОФІН.

ГАРАДОК — 31,1 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЭЛЬМАН, старшыня РВК ЯУДАСЕЎ.

ТАЛАЧЫН — 50,8 проц. Сакратар РК КП(б)Б СЛАВІН, старшыня РВК ЛОЦМАНАЎ.

КАНДЫДАТЫ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ

МСЬЦІСЛАЎ — 56,3 проц. Сакратар РК КП(б)Б РАМАНЕНКА, старшыня РВК МАРОН.

ГОРКІ — 58,7 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЧОРНАБРОДАЎ, старшыня РВК КАНДРАЛЬ.

ВІЦЕБСК — 46,1 проц. Сакратар РК КП(б)Б МІЦЬКОЎ, старшыня РВК КАРДАШЭНКА.

ВЕТКА — 77,4 проц. Сакратар РК КП(б)Б КАЎРЫГІН, старшыня РВК СЬЛЮКІН.

УЗАРАЦЬ ДА 10 ЧЭРВЕНЯ ЧЫСТЫЯ ПАПАРЫ

АБ ПАПАРАВАЙ КАМПАНІІ

ПАСТАНОВА НКЗ БССР

1. Зацьвердзіць плян ворыва папараў па БССР у разьмеры 420.000 га, у тым ліку па калгасах 220.000 га, з іх Ільнатрактарацэнтр — 39.000, Бульбатрактарацэнтр — 36.000 га, Збожжатрактарацэнтр — 20.000; па саўгасах 10.000 га, з іх Насентрэст — 1.481 га, Садгародтрэст — 1.467 га і па адпаасобных сялянскіх гаспадарках — 190.000 га.

2. Абавязаць райземаддзелы, МТС, саўгасы і калгасы ворыва чыстых папараў і ўгноўваньне глебы пачаць зараз-жа пасьля скончэньня сяўбы ранніх яравых культур і скончыць не пазьней 10-га чэрвеня.

У мэтах зьнішчэньня пустазельля першае асноўнае ворыва зрабіць на клыбіні — 12-15 сант. з пасьледоўным бараваньнем у 2-3 сьледы. На працягу лета правесьці 2-3 разы культывацыю, а за 12-20 дзён да сяўбы азімых дваенне чыстых папараў. Ворыва занятых папараў правесьці не пазьней як за 10-15 дзён да сяўбы.

3. Абавязаць райземаддзелы, МТС, дырэктароў саўгасаў і старшынь калгасаў увесь наяўны ў саўгасах, калгасах і адпаасобных гаспадарках гной у перыяд ворыва папараў вывазіць і заараць пад пасеў азімых, угноўваючы наўныя палі севазвароту.

Работу па вывазцы наяўнага пра ветрванага торфу і вапны пастаўіць так, каб цалкам выканаць пляновае заданьне па торфаванню і вапнаванню глебы пры ворыве папараў і іх далейшай апрацоўцы. Вапну ўвесьць у першую чаргу пад тыя азімыя, дзе будзе падсяваецца ў вясну 1934 году канюшына.

Фасфарытную муку ў унясеньня пад азімы пасеў цалкам выкарыстаць пры ворыве папараў і іх дваеньні, строга захоўваючы пры ўнясеньні ўсе якасныя паказальнікі (норма ня менш 6 цнт. на га, роўнамерны расьсеў і заделка).

У перыяд міжпапар'я арганізаваць здабычу торфу на ўгнаеньне і подсьціл у колькасьці, неабходнай для торфаваньня глебы ў веснавы перыяд 1934 году, правёўшы, як мінімум, загатоўку сухога торфу па 0,5 тоны на галаву буйнай рагатай жывёлы для гаспадарак, якія знаходзяцца ў 3-хкілёмэтравым радыусе ад балот.

4. Абавязаць трактарацэнтры, МТС і дырэктароў саўгасаў зараз-жа па скончэньні сяўбы ранніх яравых культур пераключыць на апрацоўку папараў ня менш 80 проц. наяўных трактараў.

Зацьвердзіць унесеныя кіраўніцтвам расьлінагалоўлі абавязковыя агправілы па апрацоўцы папараў.

Прапанаваць райземаддзелам на падставе іх выпрацаваць агправілы для раёнаў і безадкладна давесьці іх да калгасаў, сельсаветаў і паселішчаў.

5. Абавязаць трактарацэнтры, саўгастрэсы, райза і МТС арганізаваць кантроль якасьці апрацоўкі папараў і інш. с.-г. работ, усклаўшы адказнасьць за якасьць работы:

а) па адпаасобных сялянскіх гаспадарках — на ўпаўнаважаных 10-ці-дворак і старшынь сельсаветаў;

б) у калгасных брыгадах — на брыгадзіраў і па калгасах — на старшынь праўленьня калгасаў;

в) па саўгасах — на старшых рабочых і дырэктароў;

г) па МТС — на агранома ў вытворчых вучастках і старшых агранома ў;

д) па усім раёне — на райагранома ў ці агранома ў, спэцыяльна вылучаных па агракантролі з існуючага штату.

6. Абавязаць райза забясьпечыць арганізацыю грамадзкага агракантролю якасьці работы шляхам вылучэньня ў кожным калгасе камісіі па агракантролі, выбіраемай у складзе 3-5 чалавек на агульных сходах з лепшых калгасьнікаў-ударнікаў і арганізацыі груп па агракантролі пры С. Н. сэкцыях сельсаветаў.

7. Даручыць к-ву арганізацыі працы і разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў калгасах пад асабістую адказнасьць тав. Залескага не пазьней 25-га мая даць разгорнутыя ўказаньні аб парадку пераключэньня сталых палеводчых брыгад з веснавой сяўбы на папараваю, прапалотную і ўборачную кампаніі і нараду расстаноўкі рабочай сілы ў калгасах і брыгадах на работах у часе ворыва папараў, прапалкі і ўборкі ўраджаю.

Нарком Земляробства БССР БЭНЭК.

ТРАКТАРНЫ ГІГАНТ НА РУБЯЖЫ ЭЎРОПЫ І АЗІІ

У маі 1929 году ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу пастанавілі прыступіць да пабудовы на Ўраде трактарнага заводу, разлічанага на выпуск 40 тысяч трактараў у год. Месцам будаўніцтва выбран г. Чалябінск. Некалі — перасыльны пункт, павятовы, брудны горад, які гандляваў збожжам, скурай і салам. Такі твар старой Чалябы.

Цяпер кошт гадавой прадукцыі прамысловасьці Чалябінску перавышае ў 100 РАЗ даваенную прадукцыю. Старая перасыльная яма ператварылася ў буйны індустрыяльны цэнтр Саюзу.

10 жніўня 1930 году былі закладзены фундаменты асноўных цахоў Чалябінскага трактарнага. 15 кая 1933 году лента вялікага канвэеру ўпяршыню пакоціла на сабе машыну новай маркі. На яе радыятары літаі марка: «ЧТЗ—СТАЛІНЕЦ».

Гэта ўжо трэцяя савецкая марка. За Сталінградам — Харкаў, за Харкавым — Чалябінск.

У барацьбе за генэральную лінію, ў жорсткіх баёх з клясавым ворагам, з апартуністамі ўсіх масьцей створан новы гігант трактарнага машынна-будаўніцтва.

ЧТЗ—адно з рашаючых зьвеньняў Урал-Кузбасу, якое практычна аніцыцыўляе лёзунг партыі: НА БАЗЕ ВЫСОКАЙ МАШЫННАЙ ТЭХНІКІ ЗАВЯРШЫЦЬ І ЗАМАЦАВАЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПЕРАБУДОВУ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ НАШАЙ КРАІНЫ.

Што такое ЧТЗ? Некалькі лічбаў даюць поўнае ўяўленьне аб разьмерах і маштабах гэтага гіганту.

Завод разлічан на масавы патокавы выпуск 60-сілавых гусенічных трактараў: 40 тысяч машын у год. Нідзе ў сьвеце няма такога прадпрыемства!

Плошча механазборачнага цаху заводу ў два разы больш адпаведнага цаху на Сталінградзкім або Харкаўскім заводах.

Сталіліцейны цэх заводу абсталяван адзіным у сьвеце электрычным канвэерам для масавага фасоннага сталёвага ліцьця. Прадукцыйнасьць гэтага цаху — 200 тон у сутні.

Цэх чыгуннага ліцьця павінен даць 400 тон прадукцыі ў сутні.

Кавальскі цэх Чалябінскага трактарнага — самы вялікі штамповальны цэх Саюзу. Яго сутачная прадукцыйнасьць — 400 тон годнай штамповукі. Цэх абсталяван самымі магутнымі ў Саюзе молатамі — па 18.000 фунтаў. Гэтыя штампы — у 1½ разы больш паровых штампаў СТЗ.

Механічны цэх прадпрыемства — гэта 1.500 розных найдакладнейшых варштатаў.

Зборка трактару — на канвэры. Галоўны зборачны канвэр ЧТЗ даў жыцьцё ў 240 мтр. Гэта самы вялікі з усіх існуючых у сьвеце зборачных канвэераў.

У цэхах заводу штодзенна пераапрацоўваюцца 268 вагонаў сырцу.

Трактар «Сталінец-60» вытворчасьці ЧТЗ — адзін з лепшых трактараў з гусенічным ходам. Ён свабодна цягне плуг з дзесяцю лемехамі, да яго можна прыцаніць 2-3 камбайны або 5 двухрадных сарахадыскавых барон.

ПАЗЫКА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

Перадавыя раёны-вазьмеце на сацыялістычны буксір адстаючыя

Усяго па БССР на 30 мая рэалізавана пазыкі 2-й пяцігодкі 53.659 тысяч рублёў, што складае 79,6 проц. заданьня

Вінавата парт'ячэйка

У той час, калі ўжо шмат раёнаў, гарадоў, вёсак і калгасаў закончылі рэалізацыю «пазыкі другой пяцігодкі», торфзавод «Свабода» толькі пры ступае да гэтай работы.

Зарплата па заводу складае 30.000 руб., а рэалізавана пазыкі ўсяго на 15.341 руб., або 50 проц. месячнага фонду зарплаты.

Лічба, зразумела, новыстрачальная.

Прычына—адсутнічае культмасавая работа, прафком заводу не вядзе належнай растлумачальнай работы сярод рабочых. Аблігацыі пазыкі «чацьвертага завяршальнага» не разданы пасьпічыкам яшчэ і да сёньняшняга дня. На заявы рабочых на сходах, на пасьпяшэньнях прафкому аб выдачы аблігацый ніхто не рэагуе. Зразумела, гэта не агітуе за пасыпховую падпіску на пазыку.

Высьвятленьнем прычын, хто вінават у гэтых злачынна недапушчальных фактах, як дырэкцыя заводу, так і парт. і прафарганізацыі не займаюцца.

Камсод, які ёсьць на заводзе і на чале якога стаіць тав. **Бабенка**, і кроку не зрабіў як у напрамку палажаньня абслугоўваньня пазыкатрымальнікаў і разьлікаў з падпісчыкамі па пазыцы «чацьвертага завяршальнага», так і ў напрамку рэалізацыі «пазыкі другой пяцігодкі».

Рэалізацыя пазыкі ў суме 15.000 руб. прайшла самацёкам. Работай гэтай пакуль што займаецца толькі эдзін старшыня прафкамітэту **Арановіч**. Дапамогі-ж з боку парт'ячэйкі, камсамольскай ячэйкі ніякай няма.

Не гаворачы ўжо аб дрэнным падпісцы на пазыку асобных рабочых, нават члены прафкамітэту цягнуцца ў хвасьце самых адсталых мас сэзонных рабочых.

Камсамольская ячэйка замест разгортваньня палітычна-масавай работы сярод рабочых і мабілізацыі на яе правядзеньне ўсіх камсамольцаў, нават не абгаварыла на бюро пытаньня аб правядзеньні гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі. **Б.**

Чэрвоны СЬПІС

раёнаў, ме. гэнных рэалізацыі пазыкі другой

Чашніцкі	51,0 проц.
Дубровенскі	48,8 »
Сіроцінскі	48,3 »
Ельскі	48,1 »
Чавускі	47,8 »
Гарадоцкі	45,9»
Шклоўскі	45,2 »
Вушацкі	44,3 »
Клічаўскі	43,2 —
Чырвонапольскі	42,6 »
Церахаўскі	41,1 »
Талачынскі	39,3 »
Чачэрскі	38,8 »
Прапойскі	38,3 »
Лепельскі	38,3 »
Чэрыкаўскі	35,7 »
Суражскі	33,0 »
Крупскі	32,7 »
Парыцкі	32,4 »
Карыкінскі	31,7 »
Веткаўскі	31,5 »
Бешанковіцкі	30,2 »
Уваравіцкі	14,6 »

Ударнікі фінансавага фронту

На здымку: справа — каваль фабрыкі «Труд» (Гомель) тав. ХАЦКЕВІЧ і работніца штампавальнага цаху ф-кі т. ХАДЗЕЕВА — ударнікі фінфронту.

Гомельшчына рапартуе аб перамозе

ЦК КП(б)Б — ГІКАЛО, СНК БССР — ГАЛАДЗЕДУ, РЭДАКЦЫІ «ЗЬВЯЗДЫ», НАРКАМФІНУ

ГОМЕЛЬ. (Маланка). Заданьне па рэалізацыі пазыкі па Гомельскім раёне ў 5.262 тыс. руб. 28-га мая выканана на 100,2 проц. Падпіска працягваецца.

Гэта новая перамога ёсьць вынік бальшавіцкага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б і мясцовых партыйных арганізацый і вялізарнейшага ўздыму актыўнасьці, праяўленай шырокімі працоўнымі масамі Гомельшчыны, якія галасавалі за пазыку другой пяцігодкі.

Няхай жыве УсеКП(б) — арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва на чале з правадыром сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіным!

ГАРКОМ КП(б)Б.
ГАРПРАФСАВЕТ.

Полаччына выканала заданьне

ЦК КП(б)Б — ГІКАЛО, ЦВК БССР — ЧАРВЯКОВУ, СНК — ГАЛАДЗЕДУ, НАРКАМФІНУ — ХАЦКЕВІЧУ, РЭДАКЦЫІ «ЗЬВЯЗДЫ»

ПОЛАЦАК. (Маланка). Плян рэалізацыі пазыкі ў 1.551 тыс. рублёў выкананы на 100,6 проц. Сума падпіскі — 1.560 тыс. Працягваем рэалізацыю пазыкі з мэтай ахопу падпіскай усіх працоўных раёну.

ЯЎСЕЕНКА, ШАБОЛТАС, БРАЎДЭ.

Першы з першых

Калгас імя АДПУ, Менскага раёну, атрымлівае перамогу за перамогай. Скончыў сяўбу ўсяго яравога клину яшчэ да 7 мая. Аб гэтым ён рапартаваў партыі і ўраду і заклікаў адстаючыя калгасы браць з яго прыклад.

Тульскія рабочыя зьвярнуліся з заклікам да пралетарыяту і ўраду СССР аб выпуску новай пазыкі, «пазыкі другой пяцігодкі».

14 мая калгасьнікі калгасу імя АДПУ адгукнуліся сваёй адозвай на адозву тульскага пралетарыяту.

І гэта дэклярацыя калгасьнікаў не засталася пустым гукам. Калгасьнікі на справе даказалі сваю гатоўнасьць аддаць справе пабудовы новага грамадзтва ўсе свае сілы, усе свае сродкі, —стакалі свой энтузіязм.

У першы-ж дзень рэалізацыі пазыкі ў калгасе разгарнулася шырокае сацыяборніцтва паміж брыгадамі і аднаасобнымі калгасьнікамі за поўную рэалізацыю пазыкі і ахоп падпіскай усіх калгасьнікаў.

У палудзенны перапынак было тэрмінова склікана пасяджэньне праўленьня разам з кандыдацкай групай калгасу, камсамольцамі і актывам. На праўленьні выпрацавалі мэтады і формы правядзеньня падпіскі на пазыку. Камсамольскі актыў арганізаваў выпуск бюлетэню, спэцыяльна прысьвечанага падпісцы. Брыгадзіры тав. **Карбановіч** (брыгада № 2), тав. **Паплаўскі** (брыгада № 3) і тав. **Камоцкі** (брыгада № 1) абавязаліся правесьці падпіску на брыгадах.

Работа закіпела. Брыгадзіры пайшлі па брыгадах з падпіснымі лістамі. Кожная брыгада не хацела адставаць ад другой. Кожны брыгадзір, кожны калгасьнік хацелі быць на першым месцы. Лічба за лічбай, подпіс за подпісам запаўнялі падпісныя лісты. Падпіска расла.

Над вечар брыгадзіры сабраліся падвесьці вынікі падпіскі. Першая брыгада падпісалася на **4.545 руб.**, другая — **на 4.695 руб.** і трэцяя — **на 4.860 руб. Усяго пазыкі рэалізавана на 14.100 руб.**, або 200 проц. месячнага акладу.

Увечары камсамольскім актывам быў выпушчан бюлетэнь ходу падпіскі. Дамарошчаны «мастак» брыгады № 3 з брыгадзірам **Паплаўскім**, заняўшым першае месца па падпісцы, усадзіў на самалёт. За ім пусьцілі на аўтамабілі брыгаду № 2, тав. **Карбановіча**, а ўсьлед за аўтамабілем брыгада № 1, тав. **Камоцкага**, неслася ва ўвесь галёп на рысаку.

Калгасьнікі імя АДПУ перавыканалі заданьне па рэалізацыі «пазыкі другой пяцігодкі». **М. Ц.**

С. Давідовіч

За стварэньне высокаякаснай дзіцячай кніжкі

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове падкрэсьліў, што «барацьба за бальшавіцкае выхаваньне юнацтва і дзяцей у духу ленінізму, задача інтэрнацыянальнага выхаваньня пралетарскай калгаснай моладзі Савецкага саюзу на даным гістарычным этапе патрабуе выключнай увагі да літаратуры для моладзі і дзяцей». Аднак, у Беларусі пытаньне дзіцячай літаратуры настаўлена на сапраўды шырокае абмеркаваньне толькі цяпер. Таму зусім зразумела, што парада па дзіцячай літаратуры, якая нядаўна адбылася, прыцягнула да сябе ўвагу ўсёй грамадзкасьці. Перад нарадай стаяла важная задача — падвесьці вынікі ўжо пройдзенага шляху, праз крытыку і самакрытыку выявіць сапраўднае становішча дзіцячай літаратуры, наколькі яна адпавядае запатрабаваньням камуністычнага выхаваньня дзяцей, акрэсьліць далейшыя шляхі разьвіцьця дзіцячай літаратуры. У гэтым напрамку парада бязумоўна дасягнула пэўных вынікаў.

Клясавая барацьба ва ўсёй літаратуры знайшла адбітак і ў дзіцячай, барацьба сродкамі мастацкага слова, за ўплыў на падрастаючае пакаленьне. Яна выявілася і ў выглядзе «лявацкіх» скажэньняў і ў працягненьні клясава - варожых ідэй. Прытуленьне клясавай пільнасьці дало магчымасьць контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчыне працягваць свае ідэі праз кніжку для дзяцей.

Усесаюзная канфэрэнцыя па дзіцячай літаратуры ў 1930 годзе сваімі «лявацкімі» ўстаноўкамі зрабіла ўплыў на значную частку дзіцячых пісьменьнікаў і тым самым зьнізіла дадатна-выхаваўчае значэньне іх твораў.

Адмаўленьне ад так званай «цікавасьці сюжэту», вузкае абмежаваньне тэматыкі, адмаўленьне ад фантастыкі, клясыкаў, казкі і,—адсутнасьць у той-жа час сацыялістычнай рэчаіснасьці, замена гэтых неабходных элемэнтаў у дзіцячай літаратуры «сюсюканьнем» і сухой інфармацыяй, — зьнізіла значэньне яе, як зброі ў камбыхаваньні ўзрастаючага пакаленьня, як крыніцы ўсебаковага разьвіцьця дзіцяці. Гэта прыводзіла часам да нездаровай цягі дзетвары да старой, непатрэбнай і шкоднай літаратуры, як кнігі Чарскай і да яе падобных.

Гістарычная пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове літаратурных арганізацый, ня менш гістарычныя пастановы аб піянэрарганізацыі і сярэдняй школе зрабілі карэнны паварот у дзіцячай літаратуры. Дзіцячая літаратура мае такі актыў, як «Ілян вялікіх работ» Ільліна, «Карабугаз» Паўстоўскага і яшчэ сотні кніг ня менш значных па сваёй высокай ідэйна-мастацкай якасьці.

Але парада павінна была падкрэсьліць, што наша беларуская дзіцячая літаратура, на жаль, значна адстала ў сваім росьце ад патрабаваньняў сучаснасьці. Побач з нашым актывам, які складаецца з некалькі значных па сваёй ідэйна-мастацкай якасьці твораў Янкі Маўра, добрых твораў Якімовіча, Шынклера, Александэра, Баранавых і раду лепшых перакладных з іншых моваў, — парада павінна была з усёй бальшавіцкай шчырасьцю прызнаць наяўнасьць значнай колькасьці халтурных, «лявацкіх», нізка-пробных па якасьці і нават клясава-варожых кніг, якія адмоўна ўплывалі на выхаваньне нашых дзяцей.

Выступаўшыя на парадзе прамоўцы зусім правільна зварочвалі ўвагу больш за ўсё на недахопы. Толькі шляхам выкрыцьця ўсяго шкоднага, кіруючыся пастановамі партыі, парада здолела намеціць далейшыя шляхі дзіцячай літаратуры. Зусім невыпадкова на парадзе адзін за адным выступаючыя пастаўнікі, дашкольныя работнікі, работнікі бібліятэк, піянэрработнікі прад'яўлялі свае рахункі савецкім пісьменьнікам, мастакам, выдавецтвам.

Дайце нашым дзецям цікавую, бадзёрую, з добрым зьместам і афармленьнем кніжку, дайце высокай ідэйна - мастацкай якасьці кніжкі, якія-б спрыялі ўсебаковаму разьвіцьцю, якія-б адпавядалі задачам выхаваньня дзяцей у духу «пралетарскага інтэрнацыяналізму, бальшавіцкай партыйнасьці» (з пастановы ЦК УсеКП(б).

Тав. Лядава (прадстаўнік усесаюзнага аргкамітэту) у сваёй прамове высунула цэлы рад творчых пытаньняў. Яна спынілася, галоўным чынам, на паказе сацыялістычнай рэчаіснасьці, пашырэньні тэматыкі, цікавасьці, момантах захапленьня чытача праз высокую ідэйна-мастацкую якасьць. Асаблівую ўвагу тав. Лядава зьвярнула на самыя слабыя пучасткі, як літаратура для дзяцей малодшага ўзросту, на якасьць мастацкага афармленьня і паўнейшую адсутнасьць крытыкі. «Для нас патрэбны ўсе жанры, акрамя пудных», — заявіла, між іншым, тав. Лядава.

Нашы савецкія пісьменьнікі, мастакі і асабліва крытыкі павінны былі шчыра прызнацца, што яны вельмі мала зрабілі для дзіцячай літаратуры. Многія з іх нават ня ведалі, што можна сказаць па гэтым пытаньні — факт, бязумоўна, невыпадковы.

Тав. Ляўкоў (загадчык культпропу ЦК КП(б)Б), якога парада выслухала з выключнай увагай, зусім ясна акрэсьліў задачы дзіцячай літаратуры, як магутнай зброі ў камуністычным выхаваньні дзяцей. Ён падкрэсьліў, што адставаньне дзіцячай літаратуры зьяўляецца вынікам адсутнасьці ўвагі да гэтага важнейшага вучастку з боку аргкамітэту ССПБ (адсюль і пісьменьнікаў), Наркамасьветы, камсамолу, піянэр-арганізацыі і кіруючых арганізацый.

Тав. Ляўкоў патрабаваў ад аргкамітэту ССПБ, Наркамасьветы, камсамолу, усёй грамадзкасьці і ў першую чаргу ад савецкіх пісьменьнікаў выключнай бальшавіцкай увагі да дзіцячай літаратуры, — забясьпечыць стварэньне патрэбных нам кніжак высокай ідэйна-мастацкай якасьці.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб стварэньні для дзяцей «бадзёрай, заклікаючай на барацьбу і перамогу» дзіцячай кніжкі, павінна быць выкапана. Словы тав. Клімковіча — «добрая кніжка для дзяцей павінна быць гонарам кожнага пісьменьніка» — трэба ператварыць у канкрэтныя справы.

Па прыкладу маскоўскіх пісьменьнікаў нашы пісьменьнікі абавязаліся ў першую чаргу даць рад твораў для зборніку да 15-годзьдзя ленінскага камсамолу. Гэта першае канкрэтнае абавязацельства ў выніку парады. Зьезд савецкіх пісьменьнікаў, які адкрываецца 10 чэрвеня, павінен будзе высунуць пытаньне дзіцячай літаратуры ў рад першачарговых задач культурнага будаўніцтва. Да ўсесаюзнага зьезду па дзіцячай літаратуры, які ўжо рыхтуецца, усе пісьменьніцкія арганізацыі павінны прыйсьці з вялікімі дасягненьнямі ў галіне стварэньня сапраўды бальшавіцкай кніжкі для дзяцей.

ПА ШПАЛЬТАХ СОВЕТСКАГА САЮЗА

СЬВІНЦОВАЯ ФАРБА З РУДЫ

Яраслаўскі лакафарбовачны завод «Перамога рабочых», які пляўна асвоіў упяршыню ў СССР, выраб казеінавых фарбаў і літаралякаў, з посьпехам працягвае барацьбу за вызваленьне краіны ад імпарту. Дагэтуль для вырабу сьвінцовых фарбаў (крона) асноўным сырцом выўляўся глет. Апошні атрымліваўся а мэталёвага сьвінцу, які ўвозіўся з-за мяжы. Гадавая патрэбнасьць адпаго толькі Яраслаўскага заводу—1.000 тон.

Замест імпартнага сырцу заводская лябараторыя знайшла мэтад вырабу сьвінцовых фарбаў (крона) непасрэдна са сьвінцовых руд, якія ёсьць у СССР. Распрацоўка руды ўжо праводзіцца ў Сярэдняй Азіі. Крон зьяўляецца асноўным матэр'ялам для зялёных фарбаў, якія шырока ўжываюцца на транспарце і ў аўтатрактарнай прамысловасьці. («Вечерняя Москва»).

ВЫСТАЎКА ПРАЕКТАЎ МАЯКА—ПОМНІКА УЛ. І. ЛЕНІНА

У Ленінградзкім гандлёвым парту арганізавана выстаўка праектаў маяка—помніка Ул. І. Леніна, прадстаўленых на міжнародны конкурс. Акрамя савецкіх скульптараў прыслалі свае праекты амэрыканскія, германскія і аўстрыйскія скульптары і архітэктары. («Водный транспорт»).

НОВЫЯ ЗАПАЛКАВЫЯ АЎТАМАТЫ

Завод імя т. Ягады ў Рыбінску асвоіў выраб новых дасканалых запалкавых аўтаматаў з высокай прадукцыйнасьцю.

Новыя аўтаматы будуць даваць у адну зьмену звыш 10 млн. запалак, супроць 7 млн., якія выпускаюцца існуючымі аўтаматамі. Першыя машыны будуць выпушчаны ў 1934 годзе («Ленинградская Правда»).

КАШТОЎНАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ СПАДЧЫНА

Азэрбайджанскае аддзяленьне Акадэміі Навук набыло літаратурныя рукапісы вядомага цюркскага пісьменьніка-драматурга Моллы Насрэдзіна. Сярод рукапісаў знойдзены невядомыя дагэтуль камэдыі, п'есы і апавяданьні, а таксама надрабязная аўтабіяграфія пісьменьніка. Літаратурная сэкцыя аддзяленьня падрыхтоўвае выданьне поўнага збору твораў Моллы Насрэдзіна. («Бакинский рабочий»).

ПРЫЕЗД ДЭЛЕГАЦЫІ БЕЗАНЧУГСКІХ КАЛГАСЬНІКАЎ У ЗАКАЎКАЗЬЗЕ

З посьпехам скончыўшы воснавую сяўбу, калгасьнікі, калгасаў раёну дзейнасьці Безанчугскай МТС паслалі некалькі дэлегатаў у калгасы Закаўказьзя для абмену вопытам барацьбы за высокі ўраджай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Прыезд дэлегатаў выклікаў жывы ўдзым вытворчай актыўнасьці калгасьнікаў Закаўказьзя. («Заря Востока»).

ЗАМЕСТ ІМПАРТНАЙ ПРОБКІ—КАРА АКСАМІТНАГА ДРЭВА

Далёка-Ўсходні край багаты зарасьлямі аксамітнага дрэва, кара якога лепш за ўсе іншыя замяняе дарагую імпартную пробку. Аксамітнае дрэва расьце толькі на Далёкім Ўсходзе. Запасы кары гэтага дрэва складаюць паводле прыблізных даных каля 350 тыс. тон. Яны могуць забясьпечыць Саюзкі Саюз добрай пробкай на дзесяткі год і зэканоміць мільёны рублёў золатам.

У гэтым годзе на Далёка-Ўсходнім краі павінна быць заготаўлена 2.000 тон кары аксамітнага дрэва. («Тихоокеанская Звезда»).

ВЫРАТАВАН ПАРАХОД «ХАРКІВ».

Дзякуючы гераічнай рабоце ЭПРОНу і групы рабочых судна-рамонтнага заводу імя Марці ўдалося выратаваць і прывезьці ў порт вялікі савецкі параход «Харкіў», ёмкасьцю ў 11 тысяч тон.

Параход пацярпеў аварыю 8 сакавіка, калі ён ішоў у глыбокім тумане і ў паўднёва-заходняй частцы Чорнага мора наскочыў на скалу. Аварыя выклікала пералом корпусу судна.

Параход выратаван вельмі цікавым спосабам, рэдкім у сусьветнай морской практыцы. Для таго, каб зьняць яго са скалы, трэба было разрэзаць корпус на дзьве паловы. Гэту работу выканалі электразварщыкі заводу імя Марці, якія працавалі ў вельмі цяжкіх умовах. Пасьля гэтага былі сьцягнуты са скалы наасобку кармовая і насавая часткі судна. Яны былі дастаўлены на буксіры да сухога доку ў Севастопальскім парту. У доку абедзьве часткі судна будуць злучаны шляхам электразварки («Коммунист»).

Вопыт калгаснай ячэйкі

Шлях разьвіцьця, пройдзены калгасам «Ленинская Искра», зьяўляецца тыповым для ўсіх перадавых калгасаў Заходняй вобласьці. Арганізаваны з 45 гаспадарак, гэты калгас пад умелым кіраўніцтвам ячэйкі, перамагаючы зьвярынае супраціўленьне клясавага ворага, выкрываючы манэўры пралезшых у калгас кулакоў,—гаспадарча ўмацаваўся і вырас у адзін з буйных калгасаў вобласьці — мае каля 400 гаспадарак. У жывёлагадоўчых фэрмах калгасьніка і цьвёрда стаіць на шляху выкананьня лёзунгу тав. СТАЛІНА—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі.

Гэты калгас адным з першых скончыў у 1932 годзе ўсе сельска-гаспадарчыя кампаніі, адным з першых выканаў пляны загатовак па збожжавых культурах на 106,8 проц., па бульбе—на130 проц., па гародніне—на 125 проц. і г. д. Апрача таго, гэты калгас у парадку арганізаванага калгаснага гандлю прадаў праз свае ларкі рабочым заводу «Красный профинтерн» і рабочым станцыі Бранск-II сельгаспрадуктаў на 140 тыс. руб.

Кожны добрасумленна-працуючы калгасьнік атрымаў вялікую колькасьць прадукцыі. Кошт працадня ў гэтым калгасе ў 1932 г. у пераводзе на грошы па цьвёрдых дзяржаўных цэнах — 4 руб., а ў прадуктах калгасьнікі атрымалі за працадзень жыта—2 кгр., бульбы—10 кгр., буракоў—3,6 кгр., капусты—3 кгр. і г. д.

Вось што дала добрасумленная работа калгасьнікам і дзяржаве. Вось чаму калгасьнікі гэтага калгасу заяўляюць, што «Ніякай сіле кілсавых ворагаў не зьвярнуць нас з калгаснага шляху».

Яшчэ раз паўтараю, што сакрэт дасягненьняў гэтага калгасу ў тым, што ў калгасе ёсьць добрыя бальшавікі-арганізатары, адданыя справе людзі, якія сапраўды змагаюцца за ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК і абкому.

Сакрэт заключаецца ў тым, што партарганізацыя калгасу здолела правільна расставіць свае сілы па брыгадах, разгарнуць штодзенную масавую работу сярод калгасьнікаў, здолела згрупаваць і выхаваць вакол сябе калгасны актыў, здолела лепшых актывістаў уцягнуць у партыю і за іх лік вырасьці за два гады з 8 чалавек да 32.

Ажыцьцяўляючы дырэктывы ЦК, ячэйка галоўную ўвагу аддала пытаньням калгаснай вытворчасьці: стварэньне і замацаваньне пастаянных вытворчых брыгад, правільная арганізацыя працы, барацьба за жалезную працоўную дысцыпліну, за высокую якасьць калгаснай працы.

У рашучай барацьбе супроць клясавага ворага, пралезшага ў гэты калгас, у барацьбе з апартуністычнымі настроямі пасобных членаў партарганізацыі, ячэйка калгасу «Ленинская Искра» праявіла вялікую выхаваўчую работу сярод сваіх членаў і ўсёй калгаснай масы, заваявала для свайго калгасу ганаровую назву—чырвонасьцяжнага.

Сакратар Зах. абкому УсеКП(б) І. РУМЯНЦАЎ.

Парт'ячэйка калгасу «Ленинская Искра» (Зах. вобласьць) усьвядомляючы, што галоўная задача не заключаецца ў тым, каб пабавовы падрыхтавацца да сяўбы, перадусім вала сваю партыйна-масавую работу. Ячэйка пераключыла свае сілы па барацьбу за ранняю сяўбу, за далейшую правільную расстаноўку партыйных сіл у падрыхтоўцы да першай калгаснай сяўбы другой пяцігодкі.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб стварэньні пасенных фондаў была давядзена да кожнага калгасьніка, абгаворвалася на партыйным сходзе.

Парт'ячэйка прыняла рашэньне за мацаваць арганізаваныя пастаянныя калгасныя брыгады, не дапускаючы ў іх бягучасьці, і пастанавіла пакінуць іх на выкананьні сельска-гаспадарчых работ у 1933 г. Парт'ячэйка разам з праўленьнем калгасу замацавалі за гэтымі брыгадамі вытворчыя вучасткі, давялі плян—заданьне да кожнага брыгадзіра і брыгады. Апошнія ў сваю чаргу устанавілі апэратыўны нагляд за захаваньнем брыгадзтага пасеннага фонду, становішчам конскага складу, рамонтам с.-г. прылад.

Плян веснавых пасеўных работ да ведзен да кожнага камуніста, брыгады і калгасьніка. Вакол гэтага камуністы разгарнулі вялікую масавую партыйную работу, праводзілі нарады з калгаснымі актывам у брыгадах, знаёмячы іх са сталым глебы і з сеязваротам.

Адзначальнай асаблівасьцю складзенага вытворчага пляну калгасу на 1933 год і асноўным зьвяном гэтага пляну зьяўляецца перанясеньне цэнтру цяжару ўсёй работы ў пастаянную вытворчую брыгаду. У сувязі з гэтым партыйная ячэйка па вопыце калгаснага пляніраваньня мінулага году вядзе сваю партыйна-масавую работу. Ня толькі брыгадзіры, але і ўся брыгада прымала ўдзел у складаньні фінансава-вытворчага пляну брыгады і калгасу. Партыйная ячэйка тут-жа мабілізуе калгасьнікаў на складаньне пляну, растлумачвае ім, што гэты плян павінен быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін. На гэтай падставе брыгады ўзмацняюць тэмпы работы па падрыхтоўцы да сяўбы.

Брыгада № 5, кандыдата партыі **Гайдашава**, паказвае лепшыя ўзоры бальшавіцкай падрыхтоўкі да сяўбы: вывезла на поле звыш 4.000 вазоў гною, поўнасьцю адрамантавала інвэнтар, кожны дзень правярала стан коняй і г. д. Гайдашаў Мікалай—калгасны рымар, падрыхтаваў усе 312 хамутоў да сяўбы, забясьпечыў бесьперабойны бягучы рамонт.

Амаль ва ўсіх брыгадах групоргі і парторгі сабралі абавязацельствы кожнага ўдзельніка брыгады ня мець прагулаў у дні падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы. У асобных брыгадах (у 3-ай, 5-ай) парторгі **Трахачаў** і **Фандзюшын** арганізавалі сустрэчныя на ўпчыльненьні тэрмінаў сяўбы і павышэньні ўраджайнасьці.

Калгас «Ленинская Искра» з усёй Заходняй вобласьці быў прадстаўлен на нарадзе ў Наркамземе з дакладам аб складаньні пляну нарады для брыгады. Над гэтай справай парт'ячэйка, праўленьне калгасу, камуністы-калгасьнікі, а разам з імі агранам **Дзенежкін** нямала папрацавалі. У розультаце плян-нарад, складзены для брыгад калгасу «Ленинская Искра», быў ухвален на ўсесаюзнай нарадзе ў Наркамземе, якою кіраваў Наркамзем СССР тав. **Якаўлеў**. Плян-нарад для брыгад быў рэкамэндован, як узор для ўсіх калгасаў Савецкага саюзу.

Найцікавейшы вопыт барацьбы за вытворчую дысцыпліну паказвае чырвонасьцяжны калгас «Ленинская Искра» і яго парт'ячэйка.

Працякалі зімовыя дні. Набліжалася трэцяя бальшавіцкая вясна. Калгасьнікі «Ленинскай Искры», арганізаваныя ў вытворчыя брыгады, былі ва ўсеўзбраеньні. Яны заўчасна падрыхтаваліся да таго, каб зараз-жа пасьля таяньня сьнегу рушыць на шырокія калгасныя палі.

Да гэтага часу парт'ячэйка і праўленьне калгасу пасьпелі ўжо правесьці вялізарную масавую палітыка-выхаваўчую і растлумачальную работу сярод калгасьнікаў. На агульна-калгасным, парткамсамольскім, брыгадных, жаночых сходах, на вытворчых парадах і г. д.—усюды абгаворвалася пытаньне аб працоўнай дысцыпліне. Пры гэтым парт'ячэйка вельмі пераканаўча з лічбовымі данымі, расказала ўсім калгасьнікам, якая вялікая шкода і страта была зроблена калгасу прагульшчыкамі і лодырамі ў 1931 г. і які станоўчы эфэкт далі сумленна працуючыя калгасьнікі.

Тут, на канкрэтных прыкладах ячэйка мабілізавала калгасьнікаў на барацьбу з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны. У выніку правядзенай работы калгасная маса была ўцягнута ў сацыяборніцтва і ўдарніцтва. Кожная брыгада і калгасьнік у паасобку бралі на сябе абавязацельства ня мець прагулаў і спазьненьняў на працу. У гэтай справе камуністы былі застрэльшчыкамі.

Але барацьба за жалезную дысцыпліну ў калгасе ішла ня так гладка. Пралезшыя ў калгас кулацкія элемэнты і цьвёрдазаданьнікі дзейнічалі «ціхай сапай», граючы на адсталых дробна-ўласьніцкіх настроях асобных калгасьнікаў.

Выпрабаваны мэтад работы парт'ячэйкі калгасу «Ленинская Искра» — гэта масавасьць. У самую гарачую пару бальшавікі калгасу выявілі, што прагулы пачалі даходзіць да 10,15 проц. Адразу-ж быў склікан парткамсамольскі сход, потым беспартыйны калгасны актыў. На гэтых сходах быў распрацован канкрэтны плян дзеяньняў па ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны.

Ва ўмацаваньні працоўнай дысцыпліны вялікую ролю адыграла кіраванная парт'ячэйкай калгасная насьценгазэта «**Ударник полей**» і брыгадныя насьценгазэты, якія апэрацыйна кожны дзень асьвятлялі пытаньні дысцыпліны, паказваючы канкрэтных прагульшчыкаў — іх імёны і прозьвішчы, якую шкоду калгасу яны прынесьлі ў лічбах—прастоі с.-г. машын, цягавай сілы і г. д.

Па ініцыятыве бюро парт'ячэйкі праўленьне калгасу склікала прагульшчыкаў. Па нараду былі запрошаны таксама лепшыя ўдарнікі працоўнай дысцыпліны, якія дзяліліся сваім вопытам работы і прысаромілі прагульшчыкаў. У розультаце гэтага ячэйка дабілася значных посьпехаў: на палёх працаваць пачало 97-98 процантаў калгасьнікаў.

Камуністы, камсамольцы, дэпутаты сельсавету і ўдарнікі з ліку беспартыйнага актыву арганізавалі ў полі дошкі «гонару» і «ганьбы». На спэцыяльных плякатах паказваліся пра гульшчыкі.

Парт'ячэйка штодзенна паведамляла калгасьнікаў аб становішчы працоўнай дысцыпліны. Праз парторгаў і чытараў ячэйка даводзіла да кожнага калгасьніка аб становішчы працдысцыпліны ў іншых калгасах.

У розультаце праведзенай вялікай партмасавай работы большасьць калгасьнікаў добра і сумленна працавала на калгасных палёх.

Тав. Сталін у сваёй прамове на першым усесаюзным зьезьдзе ўдарнікаў-калгасьнікаў вусім справядліва сказаў: «Жанчына ў калгасах—вялікая сіла. Наш абавязак заключаецца ў тым, каб высоўваць наперад жанчыну ў калгасах і пусьціць гэту сілу ў справу». Парт'ячэйка і праўленьне калгасу «Ленинская Искра» прарабілі вялікую работу ў гэтым напрамку. Арганізавалі агульна-калгасную сталоўку, дзіцячую пляцоўку, яслі і г. д., што адыграла вялікую ролю ў галіне значнага павышэньня працдысцыпліны сярод калгасьніц, аж да пагалоўнага іх выхаду на работу ў поле. Камуністкі зьяўляюцца пачынальніцамі моцнай працоўнай дысцыпліны. Яны, будучы самі прыкладам, вядуць за сабой беспартыйных калгасьніц.

Калгас адным з першых у раёне выступіў у бой за сяўбу. Парт'ячэйка перанесла масавую палітработу непасрэдна ў брыгаду, на поле. Ва ўсіх брыгадах праводзяцца гутаркі і чытаньні аб працоўнай дысцыпліне. Першыя дні сяўбы паказалі ўдарную работу. Нормы перавыкананы на 30-40 проц.

У сыстэме партмасавай работы калгасных ячэек павінна заняць адно з першых мосц мабілізацыя камуністаў, камсамольцаў і калгасьнікаў на барацьбу за ахову грамадзкай уласнасьці, супроць зладзеяў і расхітальнікаў калгаснага дабра.

Зробім нашу партыю яшчэ больш баявой, баяздольнай для пабудовы бясклясавага грамадзтва

Даклад старшыні Цэнтральнай камісіі па чыстцы КП(б)Б т. АНЦІПАВА на сходзе ўсебеларускага партактыву 28 мая

Таварышы, па пытаньні аб чыстцы партыі ёсьць ужо даволі вялікая колькасьць матар'ялу: апублікавана пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) па чыстцы партыі, інструкцыя аб чыстцы, на ваш актыве т. Лычовым і т. Гікало былі зроблены падрабязныя наведамленьні аб чыстцы, у якіх таварышы спыніліся на ўсіх пытаньнях, зьвязаных з правядзеньнем чысткі і са станам КП(б)Б. Пры гэтым дана даволі падрабязна характарыстыка арганізацыі. І трэцяе—мэтады чысткі.

Я ня буду паўтараць таго, што таварышы таварылі, а возьму толькі тры пытаньні, якія лічу неабходным больш падрабязна асьвятліць.

Першае пытаньне—гэта прычыны чысткі. Чаму ЦК партыі і ЦКК парашылі абвясьціць чыстку? Ці выцякае гэта з нашай сілы, з нашай моцы, або з нашай слабасьці?

Другое пытаньне—асаблівасьці чысткі, якія выцякаюць з асобнага становішча беларускай арганізацыі. І трэцяе—мэтады чысткі.

НАША ПАРТЫЯ—САМАЯ МАГУТНАЯ ПАРТЫЯ У СЬВЕЦЕ

Мы ня першы раз праводзім чыстку. Чыстка стала адбыткам нашай партыі. Мы бачым, што чыстка стала ўжыцца фашыстамі ў іх арганізацыях. Яны ўзялі наш прыклад і такімі-ж спосабамі ў сябе праводзяць гэту чыстку. Але розьніца, таварышы, у тым, што фашысцкія чысткі—гэта чысткі ад слабасьці. Гэтыя чысткі праводзяцца таму, што працоўныя, якія туды трапілі—выпадкова ці шляхам ашуканства,—уздымаюць балючыя, надзённыя для іх пытаньні, і іх пачынаюць вычышчаць. Гэта—чысткі для таго, каб пазбавіцца ад рабочых.

Нашы чысткі маюць зусім адваротнае значэньне. Наша чыстка—гэта умацненьне сувязі з масамі і ачыстка партыі ад тых элемэнтаў, якія перашкаджаюць умацаваньню сувязі з масамі. Мы нашы чысткі праводзім таму, што мы моцныя, што мы далей хочам рухацца з яшчэ большай шпаркасьцю.

У гэту чысткў мы ўступаем умацаванымі, мы маем гігантскія посьпехі ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва. Мы закончылі пяцігодку і тым самым заклалі моцны фундамант нашага сацыялістычнага грамадзтва. Вялікі план індустрыялізацыі краіны, перабудовы сельскай гаспадаркі мы выканалі бліскуча. За гэты час мы змаглі ўмацаваць абароназдольнасьць нашай краіны. Мы на гэты час ня толькі выканалі, але значна перавыканалі план перабудовы нашай вёскі на новых сацыялістычных пачатках. За гэты час у асноўным ліквідавалі кулацтва як клясу, вырвалі з-пад яго эканамічную базу. Мы ўмацавалі калгасны лад, умацавалі калгасы і тым самым адкрылі новы шырокі шлях сацыялістычнаму будаўніцтву ў вёсцы. Наша партыя разьбіла ўсе антыпартыйныя групоўкі, якія былі, разьбіла ўшчэнт, і лідэры гэтых груповак выступаюць цяпер з самымі пакаяннымі заявамі аб сваіх памылках. Усё гэта, таварышы, паказвае нашу гігантскую сілу, сілу нашай партыі. Гэта паказвае і той рост партыі, які мы маем за гэтыя два з паловай гады: наша партыя, як вы ведаеце, вырасла за гэты перыяд на 1.400 тыс. чалавек.

Вось, таварышы, тыя вынікі, з якімі мы ўступаем у гэту чыстку. Вынікі становчыя, вынікі вялізарных дасягненьняў. Мы зараз памічаем яшчэ больш гігантскі план другой пяцігодкі, план, які паставіў нашу краіну, як першую краіну ў сьвеце на індустрыялізацыі: план пабудовы бясклясавага грамадзтва, грандыёзны плян палажэньня матар'яльнага становішча працоўных. І гэтыя задачы намячаюцца таксама, як і ў першай пяцігодцы, не ў пустую, не на пяску, а на рэальнай аснове тэй работы, якая праведзена тых настроеў, якія ў нас у краіне ёсьць.

Мы зараз, на аснове дасягненьняў, якія мы маем, наглядаем ва ўсёй краіне моцныя бадзёрыя настроі рабочых, калгасьнікаў па выкананьні другой пяцігодкі. Гэта відаць зараз з усіх тых дасягненьняў, якія праводзяцца работнікамі і калгасьнікамі. Мы маем у гэтым годзе, ня гледзячы на тое, што ва многіх нашых райнах Савецкага саюзу вясна значна горшая, чым у мінулым годзе (напрыклад, па Сярэдняй Азіі з пасевам бавоўны мы страцілі цэлых 15 дзён параўнальна з мінулым годам а-за позьняй вясны),—мы ні толькі ня спусьціліся на сяўбе ўсіх культур ніжэй мінулага году, але ідзем вышэй 1930 году, які быў самым высокім за апошнія тры гады. Мы мелі на 20 дату на 2,5 млн. га пасеўных плошчаў больш, чым гэта было ў 1930 годзе. У некаторых раёнах сяўба скончана раней, чым летась на 20-25 дзён.

Усё гэта зьяўляецца бясспрэчна паказальнікам настрою калгасьнікаў, настрою здаровага, калі сапраўды ўжо большасьць калгасьнікаў ня толькі зразумелі важнасьць значэньня калгасу, але пад кіраўніцтвам партыі ўпарта змагаюцца за ўмацаваньне калгасаў і гэтым самым—за палепшэньне свайго становішча.

Такі-ж паказальнік настрою мы маем сярод рабочых. Асабліва ярка гэта вы явілася пры рэалізацыі пазыкі. Не пасьпелі апублікаваць дакрэт аб пазыцы, як на наступны дзень у нашых пралетарскіх цэнтрах мы мелі ўжо 100 проц. рэалізацыі. Ясна, што гэту работу нельга прарабіць, калі да гэтага плана адпаведнага настрою. Гэты настрой ёсьць, настрой мацнейшы ў рабочай клясы—настрой гатоўнасьці і далей пад кіраўніцтвам партыі будаваць сацыялістычнае грамадзтва.

Вось тыя умовы, ў якіх мы прыступаем да выкананьня другой пяцігодкі. Зараз увесь рух наперад, хутчэйшы гэтага руху залежыць выключна ад нашай партыі. **Наша партыя зьяўляецца самай магутнай партыяй у сьвеце.** Другой партыі такой у сьвеце няма, бо наша партыя сапраўды зьяўляецца такой партыяй, на зваліку якой усе працоўныя Савецкага саюзу ідуць у бой, і таму ад таго, як наша партыя ўзброена, якую лінію будзе яна праводзіць, якія даваць практычныя мэты дырэктывы,—ад гэтага будзе залежаць і рэзультат работы.

Тав. Сталін на нарадзе сакратароў абласных і краявых арганізацый паўднёвых раёнаў, якая нядаўна праходзіла ў ЦК, сказаў, што наша партыя настолькі магутная, настолькі моцная, што мы можам правесьці самую недарэчную пастанову, але ад правядзеньня недарэчнай пастановы карысьці вельмі мала, а кожнае можа быць нетрэбнае правільнае мерапрыемства мае вялізарным рэзультаты. Таму ўсё заключаецца ў тым, каб даваць правільныя дырэктывы і гэтыя дырэктывы праводзіць у жыцьцё так, каб за іх правядзеньне білася ўся партыя, мабілізуючы ўсіх пралетараў, усіх працоўных.

Ці добра ўся наша партыя для гэтага падрыхтавана? На гэта пытаньне мы павінны даць такі адказ—ня ўся партыя. У нашай партыі ёсьць балячкі, ёсьць недахопы, ад якіх трэба пазбавіцца.

АЧЫСЬЦІЦЬ ПАРТЫЮ АД ЧУЖАНОЎ, УЗЬНЯЦЬ ІДЭЙНЫ УЗРОВЕНЬ ПАРТЫЙЦАЎ, ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ВЫХОВУАЦЬ МАСЫ

Мы за апошнія два з паловаю гады прынялі мільён чатырыста тысяч чалавек у партыю, у тым ліку прынялі чэстку людзей, зусім нам чужых, частку людзей, якія пралезьлі ў партыю з кар'ерысцкіх пабуджэньняў, а гвардзейцы пабуджэньняў, частка пралезла ў партыю сьвядома для таго, каб нам шкодзіць, пралезьлі нашы класавыя ворагі. За гэты час да нас у партыю пралезла значная частка людзей—выходцаў з ранейшых дробна-буржуазных разьбітых намі партый, пралезла значная колькасьць былых апазыцыянэраў, якія толькі на словах прызнаюцца свае памылкі, а на справе працягваюць сваю антыпартыйную палітыку.

Мы прынялі ў партыю значную колькасьць членаў партыі, мала палітычна падрыхтаваных, мала палітычна развітых і не змаглі іх па-бальшавіцку выхаваць, не змаглі зрабіць іх сапраўднымі бальшавікамі—такімі, якімі павінен быць кожны член нашай партыі, не змаглі перадаць нашы бальшавіцкія традыцыі і алсюль, у рэзультаце гэтых фактаў, мы маем слабасьць некаторых нашых ячэек, і ў першую чаргу вясковых.

Вясковыя ячэйкі зьяўляцца вельмі слабымі. Ацэнка, якую даў вясковым арганізацыям тав. Сталін, была падтверджана, яна ўсіх вядома і на апошняй нарадзе сакратароў абласных камітэтаў ён гэту характарыстыку яшчэ больш узмацніў, указаўшы, што мы на маем у вёсцы моцнай партыйнай арганізацыі. Алсюль, таварышы, слабасьць партыйнай дысцыпліны і ў першую чаргу слабасьць дысцыпліны ў нашым савецкім апараце.

Чаму гэта так адарылася, што да нас трапілі чужыя людзі, што да нас трапілі тыя ладзі, якіх мы не павінны прымаць у партыю? Гэта здараецца ад таго, што таварышы не даволі ясна ўлічылі тую абстаноўку, у якой дагэтуль працаваў цяпер працаваць і змагацца наш партыі. У радзе арганізацый панаючымі настроямі былі такія, што мы, бачыце, цяпер кулацтва як клясу ліквідавалі, школьніцтва разграмілі, апазыцыю разьбілі і што ўсё насельніцтва цяпер на сутнасьці стала савецкім, а раз так, то, значыцца, цяпер нам асабліва быць на варце няма чаго.

Такія настроі і прыводзілі да таго, што патрэбнага кантролю пры ўпуску ў партыю ў нас ня было. Даволі любому чалавеку паправаць год, або ваат паўгода на заводзе, быць ударні ам або запісацца на ударнікі, подать заяву ў партыю—і яго прымалі, не правяраючы дасканала, хто ён такі, адкуль ён. Раз кулацтва ліквідавалі, раз апазыцыянэраў разьбілі, раз усе па-савецку настроены,—значыцца, чалавек—прымай.

Мы ня ўлічылі зьмены мэтадаў барацьбы кулацтва супроць нас. Мы кулака разьбілі, падарвалі яго эканамічную базу, разьбілі—гэтага кулака эканамічна. Ясна, што кулакі ад таго, што мы іх раскулачваем, ня сталі савецкімі, іх класавая нянавісьць да нас ня зьменшылася, а ўзрасла. Але праўдзівы класавага змаганьня сталі іншымі.

Кулакі зьмянілі сваю тактыку для таго, каб іншымі сродкамі мацней улазіць на камуністычнай партыі, каб сарваць магутнасьць савецкай улады, каб вярнуць сваё ранейшае становішча. Вы ведаеце, як гэту зьмену тактыкі растлумачыў усёй партыі тав. Сталін. Каб напомніць вам гэта месца, я прачытаю вытрымку з яго прамовы: «Цяперашні кулак, падкулачнік, цяпер розныя актысавецкія элемэнты ў вёсцы, гэта пераважна людзі «ціхія», «са мудзенькія», амаль «сьвятыя», іх ня трэба шукаць далёка ад калгасу, яны сядзяць у самым калгасе і займаюць пасады калгаўшыкаў, загадчыка гаспадаркай, рахунгавода, сакратара і г. д. Яны ніколі ня скажуць—«далоў калгасы». Яны «за» калгасы, яны ведуць у калгасах такую сабатажніцкую шкодніцкую работу, што калгасу ад іх не паздаровіцца. Яны ніколі ня скажуць «далоў заготоўкі», яны «за» заготоўкі, яны толькі пускаюцца ў дэмагогіі і патрабуюць, каб калгас арганізаваў фонд для жыўёлагадоўлі ў тры разы больш, чым патрабуецца для справы. Яны патрабуюць, каб калгас арганізаваў страхавы фонд у тры разы больш, чым патрабуе гэтага справа, каб калгас выдаваў на грамадзкае харчаньне ад 6 да 10 фунтаў на работніка і г. д. Зразумела, што пасьля такіх бешчэ і выдачы на грамадзкае харчаньне эканамічная магутнасьць калгасу павінна быць падарвана, і для абожжазагатовак не застаецца месца».

Вось, таварышы, расшыфраваная так тыя клясавага ворага. Вось гэтай зьмене нашы арганізацыі ня бачылі, не зразумелі, ня здолелі ў гэты бок накіраваць барацьбу, і паколькі гэту тактыку прамаргалі, тым самым далі магчымасьць кулаку аканацца ва многіх месцах, тым самым далі магчымасьць некаторым кулацкім элемэнтам прабраца і ў нашу партыю. Кулак лез у партыю сьвядома, бо ў партыі ён недатыкальны. У партыю ён ішоў для таго, каб рабіць сваю справу—справу падрыву партыі, справу падрыву савецкай улады, што ён праводзіў усякімі спосабамі, а такіх спосабаў у яго зашмата многа. Гэта сабатаж партыйных пастаноў, гэта простае шкодніцтва і здзеўшчаньне, разлажэньне камуністаў—чэлядзі нашага клясавага ворага, якія ўжываюць вельмі-ўмела.

Вось, таварышы, чаму ЦК і ЦКК УсеКП(б) лічылі неабходным абвясьціць чыстку. Нам трэба зараз у сувязі з тымі задачамі, якія перад намі стаяць, зрабіць партыю баявой, каб кожны член партыі ведаў традыцыі бальшавікоў, традыцыі самай жорсткай пралетарскай дысцыпліны ў спалучэньні з самаадданай любоўю кожнага члена партыі да сваёй партыі, гатоўнасьці члена партыі ісьці на кожную справу, на якую яго партыя пашлае і выконваць яе з гонарам.

За апошнія два з паловай гады рабочая кляса павялічылася роўна ў два разы. На заводы і фабрыкі прышлі новыя людзі, якія ў пралетарскім катле яшчэ не пераварыліся. Прышлі людзі з вёскі, прышлі людзі з ліквідаваных дробна-буржуазных клясаў. Ясна, што праз некаторы час гэтыя людзі ў пралетарскім катле пераварацца, будуць добрымі пралетарамі, але іх трэба выхоўваць, ім трэба прышчэпляць дысцыпліну, якая павінна быць на нашых прадпрыемствах, іх трэба рабіць сьвядомымі грамадзянамі. І толькі ў тым выпадку, калі наша партыя будзе ўзорам на кожным прадпрыемстве, калі кожны член партыі будзе ўзорам па выкананьні сваёй работы, тады мы зможам хутка аб'яднаць лепшую частку старых рабочых вакол нашай партыі і з іх дапамогай хутчэй не равыхаваць поза-прышчэпных. Гэта выхаваньне трэба праводзіць хутка, бо мы стварылі зараз новую тэхніку, якая стаіць на ўзроўні самай лепшай сусьветнай тэхнікі.

Мы павінны выхаваць рабочую клясу, каб яна хутчэй гэту тэхніку асвоіла і дала такія паказальнікі работы, такую прадукцыйнасьць, якая гігантскімі крокамі рушыць наперад нашу гаспадарку. Бо, таварышы, чым вышэй грамадзтва, тым вышэй прадукцыйнасьць, і ясна, што прадукцыйнасьць нашага грамадзтва ў дзесяткі раз бу-

сапраўды ўзорам дысцыплінаванасьці таго новага тыпу рабочага, новага тыпу калгасьніка, які патрэбен нам зараз у нашым сацыялістычным грамадзтве.

Вось, таварышы, чаму нашай партыяй праводзіцца зараз чыстка. Гэта чыстка зьяўляецца жаданьнем яшчэ больш зьвязацца з масамі, бо, таварышы, чым больш дысцыплінаваным будзе кожны член партыі, чым ён будзе больш і лепшы паказальнікі даваць у сваёй рабоце, тым хутчэй мы будзем праводзіць выхаваўчую работу сярод найшырэйшых пластоў працоўных нашага неасяжнага Савецкага саюзу.

АСАБЛІВАСЬЦІ ЧЫСТКІ 1933 г.

Таварышы, гэта чыстка мае некаторыя асаблівасьці ў параўнаньні з ранейшымі чысткамі. За перыяд легальнага існаваньня партыі было дзве агульныя для ўсіх членаў партыі чысткі. Першая чыстка была ў 1921 годзе і другая чыстка ўсёй партыі была ў 1929 годзе. Мэтады правядзеньня чысткі былі розныя. Чыстка 1921 году праводзілася праз спэцыяльна створаныя камісіі зьверху: была створана цэнтральная камісія, якая ўжо прызначала губэрскія, а губэрскія камісіі прызначалі іншыя камісіі. У рэзультаце правядзеньня гэтай чысткі мы мелі скарачэньне нашай партыі на 30 проц.

Чыстка 1929 году праводзілася інакш. Яна праводзілася праз сыстэму нашых кантрольных камісій. Кожная кантрольная камісія чысьціла тую арганізацыю, якою яна была выбрана. Пры чыстцы 1929 году мы мелі скарачэньне нашай партыі на 10 проц.

Асноўны недахоп чысткі 1929 г. заключаўся ў тым, што чыстку праводзілі арганізацыя, выбраная тымі членамі партыі, якіх яна чысьціла. І таму ясна, што ўсе нашы арганізацыі бязумоўна знаходзіліся пад вельмі вялікім націскам усякіх мясцовых настроеў, інтарэсаў і мясцовых хваравітых зьяўшч.

Гэта чыстка партыі будзе праводзіцца таксама, як чыстка 1921 году, г. зн. спэцыяльна створанымі камісіямі зьверху. ЦК і ЦКК УсеКП(б) стварылі цэнтральную камісію, пастанова якой можа быць абскаржана толькі партыйнаму зьезду. Гэта камісія стварае рэспубліканскія, абласныя, краявыя камісіі; рэспубліканскія, абласныя, краявыя стваряюць адпаведныя раённыя і ячэйковыя, якія ўжо будуць праводзіць чыстку непасрэдна членаў партыі.

Тое, што зараз чыстка праводзіцца такім чынам, каб унікануць усякіх мясцовых уплываў, мясцовых настроеў, гаворыць аб тым сур'ёзным значэньні, якое ЦК і ЦКК надаюць данай чыстцы. Гэта чыстка тым самым павінна прыкаваць увагу ўсёй партыйнай арганізацыі, мабілізаваць усю партыю вакол яе правядзеньня.

Наступнай асаблівасьцю гэтай чысткі зьяўляецца сыстэма пакараньняў. Пакараньне ўжываецца толькі адно — выключэньне з партыі. Ні вымоў, ні іншых якіх-небудзь пакараньняў у гэтую чыстку ня будзе. Але гэта ня значыць, што таварышы, якія будуць пачышчаны і ня будуць мець ніякага пакараньня, будуць лічыць, што яны ашчуп «сьвятыя» (сьмех). Калі член партыі на самой справе хоча быць сапраўдным бальшавіком, то ён абавязан ня толькі ў першым чысткі, але і ў далейшай рабоце сваёй улічыць тыя памылкі і недахопы, якія ў яго ёсьць, для таго, каб быць сапраўдным бальшавіком, якім павінен быць кожны член нашай партыі.

Чыстка павінна зьяўляць нашу партыю на высокую ступень сьвядомасьці, ідэйнасьці і разуменьня задач. Таму асобна пастаўлена пытаньне аб тых таварышох, якія зьяўляюцца добрымі пралетарамі, уступіўшымі ў нашу партыю, але якія з-за таго, што яны над сабой не папрацавалі, з-за таго, што ў нас сыстэма выхаваньня культала,—яны ня досыць падкаваны, ня досыць разумеюць тыя задачы, якія партыя ставіць, ня ведаюць ні праграмы, ні тактыкі нашай партыі. І, вядома, яны партыі прынесьці карысьці ці ня могуць. Нам трэба ў партыі мець такіх таварышоў, якія могуць прынесьці карысьць партыі.

Нам ня трэба і такіх членаў партыі, якія добра ведаюць праграму, статут, разьбіраюцца ва ўсіх пытаньнях, але не працуюць, ня прыносяць карысьці партыі. Нам трэба, каб кожны член партыі разьбіраўся ва ўсіх пытаньнях і праводзіў пэўную работу сярод працоўных мас. І вось, тыя тых таварышоў, якія нічым супроць партыі не правінаваціліся, якія зьяўляюцца сумленнымі пралетарамі, але слаба разьбіраюцца, непадрыхтаваныя, — ЦК і ЦКК лічаць неабходным пераводзіць з членаў у кандыдаты і з кандыдатаў у спачуваючыя, каб тым самым сказаць таварышу: ты сумленны пралетары, але ты мала падрыхтован, ты мала над сабой працаваў, ты ня можаш прынесьці карысьці партыі, таму мы цябе пераводзім з членаў у кандыдаты, з кандыдатаў у спачуваючыя. Мы перад табой дазьвярэй не зачынем. Падрыхтуйся, працацуй над сабой і праз год, калі ты будзеш лічыць, што сапраўды над рыхтован,—падавай заяву аб прыёме ў партыю, партыя пагледзіць, правераць цябе, як ты працаваў над сабой, як дапамагаў партыі і ты можаш быць членам партыі.

Вось гэта мерапрыемства дае магчымасьць узьняць ідэйны ўзровень нашай партыі на вялізарную вышыню і, з другога боку, падштурхнуць тых таварышоў, якія мала падрыхтаваны, да работы над сабой, і кожны сумленны пралетары, які будзе пераведзен у кандыдаты або спачуваючыя, калі ён сапраўды жадае дапамагчы партыі, ён скажа, што гэта мерапрыемства правільнае і, закасаўшы рукавы, пачне працаваць над сабой, пачне практычнай работай дапамагаць партыі і праз год будзе ў члены членаў нашай партыі. Вось, таварышы, тая асаблівасьць, якая ёсьць у нас пры чыстцы 1933 году.

АСНОЎНЫЯ МОМАНТЫ ЧЫСТКІ КП(б)Б

Нам у Беларусі ў часе чысткі прыдасьцца сустрэць даволі вялікія труднасьці, бо беларускай арганізацыі прыходзіцца працаваць у вельмі складанай абстаноўцы, працаваць у вельмі цяжкіх умовах.

Якія гэта ўмовы? Адкуль яны выцякаюць? Я назаву тры асноўныя (вядома, іх безьліч), возьму найбольш істотныя.

Першае—гэта пагранічнае становішча, якое займае Беларусь.

Другое—гэта нацыянальны момант, выцякаючы з ранейшага становішча Беларусі пры царскім самаўладзьце і разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва зараз.

І трэцяе — гэта тое, што раней у Беларусі даволі моцныя былі арганізацыі дробна-буржуазных партый, у першую чаргу Бунду, і, натуральна, члены партыі не маглі не падпадаць пад уплыў гэтых людзей, асабліва калі яны да таго-ж зьяўляюцца членамі нашай партыі.

Вось тыя тры асноўныя моманты, якія я лічыў неабходным падкрэсьліць.

Тое, што Беларусь знаходзіцца пры граніцы, стварае безьліч асаблівасьцяй і труднасьцяй.

Мы будуем новае грамадзтва, грамадзтва, якое зьяўляецца маяком для рабочае клясы ўсяго сьвету, маяком для ўсіх працоўных, маяком для сялянства прыгнечаных нацыянальнасьцяй.

У нацыянальным пытаньні мы павінны будзем улічыць праўленьні і вялікадзяржаўнага шавінізму і нацыяналізму. Вялікадзяржаўны шавінізм праўляецца не з асяродзішча рабочых і працоўных. Для рабочага чужыя шавіністычныя вялікадзяржаўніцкія на строі. Для рабочага ўсё роўна—ці зьяўляецца рабочы, яго сусед па варштату, па ціскох палякам, беларусом, украінцам. І ў гады рэакцыі мы ня мелі колькі-небудзь прыкметных шавіністычных настроў сярод рабочых.

Вялікадзяржаўны шавінізм праўляецца сьвядома нашымі клясавымі ворагамі, якія маюць партыйны білет і якія шляхам усялякага ўпчамленьня асноўнай нацыянальнасьці, асноўнага насельніцтва, хочуць падбухторыць гэта насельніцтва супроць партыі, супроць савецкай улады.

Гэта робяць людзі зусім нам чужыя, або не разумеючыя нашай лініі, не разумеючыя ленінскай пастаноўкі нацыянальнага пытаньня.

І ясна, што ў часе чысткі нам трэба асабліва да гэтых элемэнтаў прыглядацца і адносіцца да іх, як да ворагаў нашай партыі, якія перашкаджаюць будаваць нам сацыялізм у нацыянальных рэспубліках.

Мы павінны таксама ўлічыць і цэлы рад момантаў скажэньня лініі партыі з боку некаторых арганізацый у нацыянальным пытаньні, праўленьня дробна-буржуазных нацыянальных настроў.

Беларусь—адна з тых рэспублік, якая ў царскі час мела самую нізкую прамысловасьць, дзе прыгнечаньне, нагарда да насельніцтва асабліва праўляліся. Зараз партыя і урад разгарнулі гігантскую работу па перабудове Беларусі. Даволі сказаць, што за апошнія два гады рабочая кляса Беларусі павялічылася ў два разы. Гэта гаворыць аб маштабах, аб тэмпах будаўніцтва.

Для таго, каб справіцца з усёй работай, якая выцякае з нашых тэмпаў, патрэбны вялікарныя кадры пісьменнай інтэлігенцыі. Новай пралетарскай інтэлігенцыі за гэты час падрыхтаваць у неабходнай колькасьці не змаглі, кадры, з якіх рыхтавалася інтэлігенцыя, былі ў малой ступені пралетарскімі, бо пралетарыяту было мала. У значнай частцы прышлося скарыстаць тыя кадры нацыянальнай буржуазнай інтэлігенцыі, якія былі ў наяўнасьці. Зразумела, скарыстаньне інтэлігенцыі—гэта задача нашай партыі. Мы павінны не адштурхваць інтэлігенцыю, павінны прыцягваць яе да сваёй працы, перавыхоўваць яе і г. д. Але ў некаторых арганізацыях мы мелі факты, калі ня мы перавыхоўвалі інтэлігенцыю, а нашы арганізацыі падпалі пад уплыў гэтай інтэлігенцыі, калі гэта неперавыхаваная інтэлігенцыя з усімі яе дробна-буржуазнымі забабонамі пераважала ў сапраўдных посьбітаў буржуазнай нацыянальнай культуры, калі нашы таварышы ўспрымалі ўсе настроі гэтай дробна-буржуазнай інтэлігенцыі за чыстую манету нацыянальнай палітыкі.

Да гэтага яшчэ трэба дадаць і тое, што за апошні год у ліку прынятых у беларускую арганізацыю ёсьць значная колькасьць выхадцаў з ранейшых дробна-буржуазных партый, у першую чаргу выхадцаў з Бунду. Нас Ленін асаблівае папярэджваў уважліва адносіцца да ранейшых меншавікоў. У часе чысткі 1921 году Ленін у артыкуле аб чысьці партыі пісаў такім чынам:

> «Як прыватную задачу чысткі партыі, я-б указаў яшчэ на ачыстку яе ад былых меншавікоў. Па-моему, з меншавікоў, уступіўшых у партыю пазьней пачатку 1918 году, трэба-б пакінуць у партыі прыкладна ня больш адной сотай долі, дый то пранерыўшы кожную такую пакідаемага тры, чатыры разы. Чаму? Таму, што меншавікі, як плынь, сказаліся за перыяд 1918—21 г. г. свае сваіх уласьцівасьці: першая—майстэрскі прыстасоўваньне, «прымазваньне» да пануючай сярод рабочых плыні; другая—яшчэ больш майстэрскі служыць верай і праўдай белагвардзейшчыне, служыць ёй на справе, адракаючыся ад яе на словах».

Ня раз Ленін зварачаўся іменна да вызначэньня гэтай сутнасьці меншавізму. Уся барацьба нашай партыі ёсьць барацьба супроць меншавізму, супроць дробна-буржуазных партый наогул, якія за ўвесь перыяд рэвалюцыі ва ўсім сьвеце паказвалі, што гэтыя партыі зьяўляюцца самай надзейнай апорай капіталістычнага грамадзтва, вернымі служкамі гэтага капіталістычнага грамадзтва. І ў нас ёсьць вельмі нязначная колькасьць людзей у гэтых партыях, якія сапраўды сумленна перайшлі на наш бок.

Ясна, што тыя арганізацыі, дзе ёсьць уплыў дробна-буржуазнай нацыяналістычнай інтэлігенцыі, у тым ліку і выхадцаў з ранейшых партый, асабліва моцнымі, баявымі ня будуць.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) за апошнія паўтары гады тры разы даваў ацэнку асобных момантаў работы беларускай арганізацыі. Першая ацэнка была ў часе пасеўнай кампаніі мінулага году. Цэнтральны Камітэт тады указаў, што беларуская арганізацыя іспыцоць гніла - лібэральныя настрої. І, нарэшце, нядаўна па справе настаўніка Сьнежкуры Цэнтральны Камітэт указаў на скажэньне нацыянальнай палітыкі.

Гэта, таварышы, працяжае ад дробна-буржуазных уплываў, якія ёсьць у арганізацыі і якія мы абавязаны асабліва ўлічыць пры падыходзе да чысткі.

Таму, таварышы, выхоўзячы з усіх асаблівасьцяй беларускай арганізацыі, нам патрэбна асабліва дасканала правераць кожнага члена партыі—хто ён такі, адкуль прыехаў, дзе раней працаваў, хто яго рэкамэндаваў у партыю і г. д. Трэба праверыць кожнага члена партыі ня толькі як ён ведае праграму і статут партыі, але праверыць, якую карысьць ён прынёс партыі ў часе працыванньня ў партыі, як ён змагаўся за генэральную лінію партыі, як ён выконваў практычную работу, як ён выконваў дырэктывы свайго ЦК і ўраду—савецкія дырэктывы.

УЗМАЦНІЦЬ НЯ ТОЛЬКІ ПАРТЫЙНУЮ, АЛЕ І САВЕЦКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

У нас ёсьць такія настроі ў некаторых арганізацыях: калі ЦК дае дырэктыву, то яе член партыі абавязан праводзіць, а калі, скажам, дае дырэктыву Сабнарком Беларусі, дык тады ён не абавязан,—гэта, бачыце, савецкая дырэктыва.

У нас, таварышы, савецкія дырэктывы нізкай розьніцы ад партыйных ня маюць. Таварышы павінны заўважыць, што ў пастанове ЦК таварыцца аб партыйнай і савецкай дысцыпліне.

Мы павінны асабліва ў часе чысткі ўзьняць на належную вышыню ня толькі партыйную, але і савецкую дысцыпліну, бо савецкая ўлада, гэта ёсьць улада, створаная нашай партыяй. Ад таго, як працуе савецкая ўлада, якую лінію яна праводзіць, якую дырэктыву дае, як гэта дырэктыва камуністамі на месцы выконваецца,—ад гэтага залежыць і становішча ў краіне, настрой працоўных мас, ад гэтага залежыць вельмі і вельмі многае, і таму ўзьняць і савецкую дысцыпліну—наш абавязак.

Мы павінны ў часе чысткі асабліва паглядзець на сыстэму работы нашых арганізацый і асабліва ўдарыць па ўсякай заслядацельскай мітусьні, якая адбі-

МЕНШ АГУЛЬНЫХ РЭЗАЛЮЦЫЙ, БОЛЬШ КАНКРЭТНАГА АПЭРАЦЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА

На апошняй нарадзе, аб якой я ўжо ўспамінаў, тав. Сталін асабліва завастраў пытаньне іменна на сыстэме работы. Ён з усёй сілай абрушыўся на нашы мэтады, калі людзі, сядзячы, ліпуць паперы, пастанову за пастановай, на адным і тым-жа пытаньні дзесяць пастаноў напішуць, а ніякага кантролю сапраўднага за тым, як гэтыя дырэктывы праводзяцца ў жыцьцё, няма. І таму пастаўлены так пытаньне: дырэктыву, прадумаўшы яе грунтоўна, дай адну замест дванаццаці, і потым усе адказныя работнікі—на месца для правядзеньня гэтай самай дырэктывы.

Так пад кіраўніцтвам тав. Сталіна мы ўжо пачалі працаваць.

Я возьму для прыкладу Данбас. Становішча ў Данбасе было дрэннае. Чаму? Таму, што ўсе інжынэрна-тэхнічныя кадры перацягнулі ў апарат кіраўніцтва. У апараце кіраўніцтва стварылі 30 аддзелаў, у кожны аддзел трэба пасадзіць інжынэраў, тэхнікаў, пісьменных людзей. У сувязі з тым, што ў шахце інжынэраў не засталося, дык дырэктывы як ваду льлюць у шахты, а толку мала — праводзіць там няма каму.

ЦК паслаў спэцыяльную камісію, якой сказаў: паглядзеце і высьвятліце даклад на, у чым прычына. Гэта камісія паехала, увесь гэты малюнак выявіла, і ЦК вырашыў мінімум палову аддзелаў ліквідаваць, мінімум палову інжынэраў і тэхнікаў, якія сядзяць, пішуць дырэктывы без карысьці, паслаць у шахты. А для таго, каб інжынэр у шахту ішоў не прымусова, а добраахвотна, вырашылі зьмяніць палітыку заработнай платы такім чынам, каб інжынэр, сядзячы ў шахце, атрымліваў больш за таго, які сядзіць у кіраўніцтве, а калі ён кіраўніцтве, дык атрымліваў значна больш, чым той, які працаваў у шахце.

Гэта пастанова была апублікавана. Дырэктыва складзена статыстыкай мовай, бо на 80 проц. яе пісаў т. Сталін. Але мала таго, што ЦК вынес добрую пастанову па вуглі. ЦК вырашыў накіраваць камісію на чале з т. Кагановічам, арганізацыйна адольнасьці якога ны ўсе ведаеце, праверыць, як праводзіцца пастанова і раскачаць арганізацыю для поўнага выкананьня. Так трэба будаваць работу.

Таму пры праверцы арганізацыі трэба паглядзець, як арганізацыя працуе, як яна перабудоўваецца, як яна кажнае засяседацельскую мітусьню і сапраўды змагаецца за праведзеньне кожнай пастановы. Усё гэта трэба ўзяць пад абстрэл і ўзяць як сьлед, тады і толк з гэтага выйдзе.

Вось тыя асаблівасьці, якія неабходна будзе ўлічыць нашым праверачным камісіям, на што трэба будзе зьвярнуць асаблівую увагу.

МЭТАДЫ ЧЫСТКІ

Я спынюся на трэцім пытаньні—на пытаньні аб мэтадах работы.

Таварышы, чыстка асабліва ў Беларусі з яе асаблівасьцямі, на якія я ўказаў, будзе вельмі цяжкай. Труднасьці за ключаюцца ў тым, што ў нас няма ў арганізацыях вывучэньня кожнага члена партыі. Наша арганізацыя сваіх членаў ня ведае—у гэтым самае цяжкае. Вы ведаеце, што анкет пры гэтай чысткі ня будзе, асабістых спраў таксама не. Таму вялікія труднасьці будуць за ключацца ў тым, каб адрозьнець свайго, сапраўды адданага члена партыі ад пры мазаўшагася, а гэта мы абавязаны зрабіць. Памылак у нас у чыстцы павінна быць мінімальная колькасьць, а раз гэта так — ад нашых праверачных камісій у першую чаргу патрабуецца самая дакладная работа, самая дакладная праверка. Нашы праверачныя камісіі не павінны шаліць за шпаркасьцю работы, не павінны наладжваць спаборніцтва — хто хутчэй, а павінны наладжваць спаборніцтва — хто лепш правядзе работу, хто вычысьціць сапраўды найбольш шкодных для партыі людзей, якія падрываюць аўтарытэт партыі. Каго з партыі чысьцілі, у пастанове ЦК і ЦКК УсеКП(б) указана зусім выразна.

Пры чыстцы трэба ўлічыць, што людзі, якія да нас у партыю прышлі для сваіх асабістых інтарэсаў, якія прышлі для сваёй падрыўной работы, гэтыя людзі пісьменныя, навыкі ў іх прыхаваны ня дрэнна (сьмех), праграму і статут партыі калі яны і ня ведалі, дык ужо вывучаюць, дакументы на аснoўных пытаньнях палітыкі партыі прачыталі. І таму, таварышы, ад камісіі будзе патрабавацца не фармальна праверыць, а зазірнуць у нутро, у дробязях не капацца, пастанова ЦК ад гэтага узмоцнена перасьцерагае, а ўважліва паглядзець, хто ён такі, адкуль, дзе, гэтыя гады правёў, што робіць, якую работу выконвае, як сябе вядзе, і тут трэба вельмі ўважліва дзеньчаць. Гэта трудна-сьць павінна быць усьвядомлена кожным членам сваёй праверачнай камісіі, гэта трудна-сьць павінна быць усьвядомлена кожным членам партыі. Ад членаў партыі патр

З ПЕРШАГА ЧЭРВЕНЯ ВСТУПАЕ У СТРОЙ ЧАЛЯБІНСКІ ТРАКТАРНЫ ЗАВОД. ЗАВОД БУДЗЕ ВЫПУСКАЦЬ ГУСЕНІЧНЫЯ МАГУТНЫЯ ТРАКТАРЫ «СТАЛІНЕЦ 60». ПЛОШЧА МЭХАНАЗБОРАЧНАГА ЦЭХУ ЧТЗ У ДВА РАЗЫ БОЛЬШАЯ ЗА ПЛОШЧУ СТАЛІНГРАДСКАГА І ХАРКАЎСКАГА ТРАКТАРНЫХ ЗАВОДАЎ.

Скарачэньне вытворчасьці цяжкай прамысловасьці Германіі

Выраб чыгуну ў красавіку зьнізіўся да 374.041 тоны, г. зн. на 9,3 проц. параўнальна з сакавіком.

Здабыча вугалю ў Рурскім басэйне таксама значна скарацілася ў той час, як запасы яго дасягнулі 11,25 млн. тон.

У парты Вэзэра (Брэменскі раён) за красавік месяц прышло ўсяго 511 параходаў, з агульным танажам 554.850 тон, што параўнальна з папярэднім месяцам дае скарачэньне на 10 проц.

Тэкстыльная прамысловасьць леваго берагу Рэйна скардзіцца, што яна зусім страціла рынкі ў **Бэльгіі і Галяндыі.** Такія-ж скаргі раздаюцца з боку **машынабудаўнічай прамысловасьці** Рэйнскай вобласьці і стальной прамысловасьці **Залінгену.**

Буйнейшыя кабельныя заводы **Фэльтэн і Гійом** толькі за першыя тры тыдні красавіка страцілі заказаў з Бэльгіі, Галяндыі і Англіі на 600 тыс. марак.

(Уласн. інфарм.).

Заміраньне цяжкай прамысловасьці у Польшчы

Востры эканамічны крызіс, які перажывае капіталістычны сьвет, з асаблівай сілай ударыў па Польшчы. Прамысловасьць не скарачаецца з кожным днём. Адна за другой спыняюцца фабрыкі і заводы. У апошнія дні польскі друк прыносіць весткі аб маючым наступіць спыненьні з 1 чэрвеня г. г. аднаго з буйнейшых заводаў цяжкай індустрыі — паравозабудаўнічага заводу фірмы **«Паровуз»** у Варшаве. Спыненьне фабрыкі, як пішуць газэты, наступае з прычыны адсутнасьці заказаў на паравозы.

Але ня толькі прамысловасьць Польшчы знаходзіцца ў стане заміраньня. Гэткае становішча мы знаходзім і ў яе гандлі. У тым-жа друку падаюцца весткі аб пастаноўцы па прычыне пяці буйных польскіх гандлёвых параходаў, якім няма чаго больш вазіць.

Польская буржуазія стараецца ўвесь цяжар крызісу перакінуць на плечы працоўных мас. Шалёнае наступленьне капіталістаў на правы і здабыткі рабочых мас ідзе поўным ходам.

Сацыял-фашысцкі **«Роботнік»** піша аб новым зьніжэньні зарплаты ніжэйшым служачым дзяржустаноў, якое мае наступіць з першага чэрвеня гэтага году. У першую чаргу мае быць зьніжана на 15 проц. зарплата ніжэйшым служачым варшаўскай універсытэцкай клінікі. У сучасны момант гэтыя служачыя атрымліваюць па 4-5 злотых за 12-гадзінны рабочы дзень. (1 зл. роўны 22 кап.).

У пісьмовым паведамленьні, якое атрымалі служачыя гэтай клінікі, зазначана: «служачыя павінны даць сваю згоду на зьніжэньне зарплаты, бо ў адваротным выпадку з 31-V—1933 году яны будуць звольнены».

(Уласн. інфарм.).

Дзяржавы Малой Антанты пратэстуюць супроць рэвізіі мірных дагавораў

ВЕНА, 29. (Белта). Як паведамляюць з Белграду, там адбыўся 50-тысячны мітынг пратэсту супроць кампаніі рэвізіі мірных дагавораў. Побач з югаслаўскімі палітычнымі дзеячамі выступалі таксама прадстаўнікі **Румыніі і Чэха-Славакіі.** У рэзалюцыі гаворыцца аб непарушнасьці граніц краін Малой Антанты.

30-тысячны мітынг пратэсту супроць рэвізіі мірных дагавораў адбыўся таксама і ў Бухарэсьце. Прамоўцы рэзка пратэставалі супроць спроб зьмены Вэрсальскага і Сэнжэрменскага дагавораў. Выступаючыя прадстаўнікі **Чэха-Славакіі** падкрэсьлілі низьменнасьць дружбы, якая зьвязвае Румынію, Югаславію і Польшчу.

Арышт сакратара рэвалюцыйных прафсаюзаў Чылі

Пры пераходзе Уругвайскай мяжы арыштаваны: сакратар рэвалюцыйных прафсаюзаў Чылі **Эліас Ляфэрт,** чыгуначны рабочы **Лейва** і дэлегат антываенняга камітэту Пэру.

Ужо больш за месяц, як арыштаваныя трымаюцца ў самым сакрэтным парадку. Ім пагражае перадача іх сваёй дзяржаве.

(Уласн. інфарм.).

Канфэрэнцыя дапамогі ахвярам германскага фашызму

ЛЁНДАН, 29. (БЕЛТА). У **Лёндане** адбылася канфэрэнцыя, скліканая **Міжрабпомам** для абмеркаваньня пытаньня аб арганізацыі дапамогі ахвярам германскага фашызму. У канфэрэнцыі прымала ўдзел 440 далегатаў, у тым ліку прадстаўнікі 70 мясцовых прафсаюзных арганізацый, 12 аддзелаў прафсаюзаў, 90 кааперацыйных таварыстваў, 50 мясцовых арганізацый кампартыі, 44 мясцовых лейбарысцкіх арганізацый і 20 арганізацый таварыства прыяцеляў СССР. Аб'яднаны савет кангрэсу трэд'юніёнаў і лейбарыстскай партыі ўключыў гэту канфэрэнцыю ў спіс тых органаў адзінага фронту, супроць якіх ён выдаў сваю «пасасьцярогу». Гэты факт выклікаў пратэсты нават з боку некаторых відных лейбарысцкіх дзеячоў. Так, напрыклад аб'яднанага савету **Элена Вількінсон** заявіла, што яна ня лічыць сябе зьвязанай пастановай савету.

Банкруцтва германскіх гарадоў

Горад **Касэль,** які на працягу многіх месяцаў не плаціць процантаў па сваіх пазыках, дасягнуўшых сумы ў 54,5 млн. марак, зьвярнуўся да сваіх крэдыторaў з просьбай аб адтэрмінаваньні гэтых плацяжоў на 1 год.

Буйныя крэдыторы налажылі арышт на даходы за электраэнэргію, газ і ваду.

(Уласн. інфарм.).

Нарада замежных крэдытораў Германіі

БЭРЛІН, 29 (Белта). Адкрылася нарада прадстаўнікоў заграніччных крэдытораў **Германіі.** У нарадзе прымаюць удзел каля 30 банкіраў **ПАЗШ, Англіі, Францыі, Галяндыі, Швэцыі і Швэйцарыі. «Бэрлінэр Бэрзэн Кур'ер»** паведамляе, што існуе плян замены формы плацяжоў па замежных абавязацельствах Германіі выпускам 4-х процантных бонаў у германскай валюце. Гэтыя боны будуць катыравацца на замежных біржах. Мяркуецца, што боны будуць забясьпечаны гарантыяй германскага ўраду, а паводле другой версіі—боны будуць станавіць сабою афіцыяльнае дзяржаўнае абавязацельства. Інакш кажучы, **абавязацельствы германскай прыватнай гаспадаркі і муніцыпалітэтаў будуць ператвораны ў дзяржаўныя абавязацельствы.**

Востры сельска-гаспадарчы крызіс у ПАЗШ

За апошнія 8 год, за невыплату падаткаў і непакрыцьцё даўгоў у Злучаных Штатах прадана звыш мільёна фэрм, складаючых адну шостую частку ўсіх фэрм ПАЗШ.

Кошт амэрыканскіх фэрм упаў з 70 міл. да 50 мл. даляраў, а іх даходнасьць — з 16 мл. даляраў у 1928 г. да 5 мл. даляраў у 1932 г.

(Уласн. інфарм.).

Замежная хроніка

* Пасьля таго, як Аўстрыя забараніла завоз югаслаўскіх тавараў, Югаслаўскі урад апублікаваў дэкрэт аб забароне завозу ў Югаславію важнейшых аўстрыйскіх экспартных тавараў.

* У сувязі з ваеннымі дзеяньнямі ў паўночным Кітаі навуковыя правінцыі спынілі куплю бавоўны, паперы, і інш. тавараў у Шанхаі. Купля мукі скарацілася на 90 проц. З усіх кітайскіх суднаходных кампаній толькі адна падтрымлівае рэгулярныя пераходныя рэйсы з паўночнымі партамі.

У сувязі з перарывам зносін спынілася дастаўка вугалю ў Шанхай ангельскай кайланскай кампаніяй. У Шанхаі недастача вугалю.

* У сувязі з увядзеньнем новых мытных тарыфаў у Кітаі, надзвычай ніспрыяльных для японскіх тавараў, японскія гандляры прыпынілі экспарт тавараў у Кітай.

Праца настаўніка павінна аплачвацца па якасьці

(Да ператарыфікацыі зарплаты настаўнікаў пачатковай і сярэдняй школы)

4-га сакавіка г. г. СНК БССР вынес пастанову «Пра ўстанаўленьне дыфэрэнцыяванай зарплаты для настаўнікаў пачатковай, сярэдняй школы і інструктароў».

Згодна гэтай пастановы, калегія Наркамасьветы БССР разам з ЦП саюзу працасьветы ўхваліла правесьці дасканалы перагляд аплаты працы настаўнікаў гэтых школ.

Зусім зразумела, якое буйнейшае палітычнае значэньне мае гэта пастанова для далейшага паляпшэньня работы школы і матар'яльна-бытавога стану настаўніка. Увядзеньне дыфэрэнцыяванай аплаты настаўніка зьяўляецца практычнай рэалізацыяй указаньня таў. Сталіна, дырэктыў партыі і ўраду аб зьнічэньні ўраўнілаўкі. **Ператарыфікацыя зарплаты працы настаўніка з улікам якасьці яго працы бязумоўна зьвяжыцца новым моцным стымулам у барацьбе за якасьць навучаньня, у барацьбе за рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе.**

Якім паказальнікі павінны будуць вызначаць якасьць працы кожнага настаўніка?

Першы з іх—гэта **ўзровень ведаў вучняў** на падставе гадавога ўліку пасьпяховасьці. Вось чаму перагляд аплаты неабходна шчыльна зьвязаць з правядзімымі ў школе праверачнымі іспытамі, якія зьяўляюцца таксама і праверкай працы настаўніка. Гэтыя іспыты павінны быць пакладзены ў аснову ператарыфікацыі.

Зразумела, што пры гэтым неабходна ўлічваць тое, наколькі настаўнік аўладаў тэхнікай падагагічнага працэсу, як ён падрыхтоўвае і якасна правяраць урок, як правярае пісьмовыя работы вучняў, як правільна і сыстэматычна падрыхтоўвае рабочыя, навучальныя планы.

Другім паказальнікам, які спрыяе якасьці вучобы, зьяўляецца дысцыпліна вучняў у групе, настаноўка ўсёй выхаваўчай работы настаўніка. Грамадзкая праца, зьвязаная са школай, праца з дзецьмі, вучнёўскімі, піянэрскімі арганізацыямі, праца сярод бацькоў—усё гэта зьяўляецца абавязковым момантамі, якія неабходна ўлічваць пры ператарыфікацыі аплаты настаўніцкай працы.

Уся работа па ператарыфікацыі будзе правяцца РКК. Гэта павышае ролю і значэньне апошніх. Гэта ставіць перад РК саюзу працасьветы і НКА баявую задачу ўмацаваньня РКК. Мы загадзя папярэджваем аб недапушчальнасьці таго, каб гэта праца па ператарыфікацыі правялася шляхам голага адміністраваньня, мэханічнага агульнага падыходу да перагляду аплаты кожнага настаўніка. Працу па ператарыфікацыі неабходна зьвязаць з дасканалай праверкай таго, наколькі правільна была ўстаноўлена папярэдняя дыфэрэнцыяваная аплата, якія адбыліся зьмены ў павышэньні адукацыі настаўніка, у яго кваліфікацыі. Гэта дапаможа выявіць лепшых настаўнікаў для прэміяваньня, гэта дасьць магчымасьць вызначыць разьмер аплаты іменна па якасьці працы настаўніка.

З другога боку, мы папярэджваем аб магчымых памылках. **Ні ў якім разе не павінны быць дапушчаны перарасходы фондаў зарплаты.** Органы Наркамасьветы ў кожным раёне і горадзе могуць рэгуляваць гэта пытаньне шляхам перасоўкі сум з адной установы ў другую.

Для таго, каб ператарыфікаваць настаўніка, у першую чаргу неабходна мець дакумантальныя даныя, якія-б сапраўды характарызавалі гадавую працу вучняў. За добраякасныя паказальнікі РКК павышае аплату працы настаўніка на адзін разрад, а настаўнікаў чацьвертага разраду прэміюе; пры дрэнных паказальніках якасьці працы дапускаецца зьніжэньне зарплаты на адзін разрад. Пры тым зусім зразумела, што настаўнік першага разраду пры неддавальняючай якасьці працы будзе прыцягвацца да абавязковага павышэньня сваёй кваліфікацыі.

У пастанове калегіі Наркамасьветы ясна заўважаны ўсе тыя труднасьці ў рабоце, якія не залежаць ад самога настаўніка. (Адсутнасьць абсталяваньня, падручнікаў, дапаможнікаў, навучальных прылад, ненаведваньне вучняў па ўважлівых прычынах, пры наяўнасьці актыўнай барацьбы з гэтым зьявішчам самаго настаўніка). Бязумоўна РКК павінна ўлічваць і асабістую ініцыятыву, і тыя прыклады ўменьня ў цяжкіх умовах дабіцца лепшых вынікаў.

Работа па ператарыфікацыі патрабуе вялікай уважлівасьці органаў Наркамасьветы і саюзу працасьветы. Тут трэба ўлічыць усе асаблівасьці раёнаў.

З другога боку, мы папярэджваем аб недапушчальнасьці якіх-бы там ні было самацёчных настрояў у данай рабоце. Некаторыя РК працасьветы і райана ня могуць на сёняшні дзень пахваліцца тым, што дырэктывы партыі і ўраду ў іх штодзённай рабоце знаходзяць бальшавіцкае праталенне. Жывым прыкладам можа служыць ханя-б Сталінскі РК саюзу, які на простыя запытаньні адказаў так: «калі дагавор не падпісан, не праверан, пераніс настаўнікаў не наладжана, членскія кніжкі не абменены». Такое амаль становішча было і ў Чэрвені да прыезду брыгады ЦП саюзу і друку.

ЦП саюзу і Наркамасьветы пасылаюць у кожны раён прадстаўнікоў для дапамогі ў правядзеньні ператарыфікацыі. Разам з тэтым таварышы будуць правяраць асноўныя галіны працы саюзу працасьветы і райана. Што трэба памятаць апошнім? Неабходна перш-за ўсё шырока разгарнуць масавую работу па растлумачэньні сутнасьці ператарыфікацыі па якасьці работы настаўніка, правесьці гэту работу ў тыя тэрміны, якія вызначаны інструкцыяй ЦП і НКА. Неабходна зараз-жа выявіць фонды зарплаты. Умацаваць РКК, арганізаваць РКК там, дзе па тых ці іншых прычынах іх ня было.

Ператарыфікацыя—работа вялізарнага палітычнага значэньня, павінна быць арганізавана з усёй бальшавіцкай выразнасьцю. Пытаньні канфліктнага паратку трэба разглядаць у прохадзенны тэрмін. Ні ў якім выпадку не ствараць лішняй цяганіны пры пераводзе настаўніка ў другую школу, даўшы яму на рукі пастанову РКК.

Апошняя, надзвычай важная заўвага, якую трэба запамятаць на мясцох. Уся работа па тарыфікацыі ні ў якім разе не павінна аслабіць выкананьня тых задач, якія стаяць перад школай і настаўніцтвам у цяперашні адказны момант. Пытаньні сяўбы, пазыкі другой пяцігодкі, пытаньні падвядзеньня вынікаў навучальнага году і падрыхтоўкі да новага,—усё гэта патрабуе ўмелага бальшавіцкага спалучэньня, што можа быць дасягнута толькі пры ўмове рацыяналізацыі работы, правільнай расстаноўкі сіл, пры бальшавіцкім плянаваньні работы, шырока разгорнутым сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве.

Клясавая пільнасьць, бальшавіцкая настойлівасьць—вось што забясьпечыць правільнае правядзеньне ператарыфікацыі, забясьпечыць далейшы рост палітэхнічнай школы, якая больш узьніме ролю школы, ролю настаўніка ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

НІКАЛАЕЎ.

Другі ўсебеларускі зорачны лодачны паход

25 ліпеня воднай секцыяй Вышэйшага Савету Фізкультуры Беларусі, разам з БАН і ТПТЭ праводзіцца другі ўсебеларускі зорачны лодачны паход, які ахопіць усе асноўныя рэкі БССР: **Заходнюю Дзьвіну, Бярэзіну, Днепр, Сож, Прыпяць і Сьвіслач.** Агульнае працяжэньне ўсіх маршрутаў звыш 2.500 кілёмэтраў. У паходзе прымуць удзел каля 500 чалавек. Паход дзеліцца на два асноўных зьвяны — сьцержневы паход і мясцовыя паходы. Сьцержневы паход праходзіць па пяці маршрутах, якія скончацца ў Кіеве і займуць 35 дзён. Мясцовыя паходы невялікіх працяжэньняў разьліваны на двухтыднёвы адпачынак рабочых фізкультурнікаў.

Галоўнай мэтай паходу зьяўляецца: папулярызацыя сярод працоўных БССР ідэй водпага спорту, праверка фізкультурных арганізацый на гатоўнасьць да здачы норм другога комплексу ГПА замацаваньне фізкультурнай сувязі з брацкімі рэспублікамі Саюзу, і, нарэшце, папулярызацыя праблемы Вялікага Дняпра.

Як сродак масава-палітычнай работы ў паход будзе ўключана адпаведная колькасьць маторных лодак, абсталяваных радыё-прыёмнымі станцыямі, кароткахвалёвымі перадатчыкамі, кіно-здымачнымі апаратамі і кіно-перасоўкамі.

Ужэльнікі паходу — лепшыя ўдарнікі выгворчасьці, якія здалі нормы «ГПА» першай ступені.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Гарком КП(б)Б склікае 1 чэрвеня, а 7 гадзіне ўвечары ў Доме Камасьветы (клюб Карла Маркса) АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ НАРАДУ ЎСІХ САКРАТАРОЎ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ І ЯЧЭЕК. На парадку дня — папярэднія вынікі ходу падрыхтоўкі да чыстки партыі.

Мастакі рыхтуюцца да усебеларускай выстаўкі

Саюзам савецкіх мастакоў БССР намечана правесьці ў бліжэйшыя два месяцы рад творчых вечароў, прысьвечаных паасобным мастаком і розным галінам працы мастацкага выдавецтва. У апошніх чыслах мая адбудзецца першы вечар, прысьвечаны творчасьці аднаго з старэйшых мастакоў БССР тав. Воўкава.

Мастак Воўкаў шырока знаёмы працоўным масам БССР па сваіх малюнках: «Рабочы», «Плытагоны», «Партызаны» і інш.

Намечана правесьці творчы вечар па абгаварэньні творчасьці скульптура-мастака **Азгура,** вядомага па скульптурных работах, якія знаходзяцца ў рэвалюцыйным і гістарычным музэях.

Зараз тав. Азгур вядзе вялікую работу па афармленьні дому ўраду бюстамі правадыроў.

Некалькі вечароў па пытаньнях афармленьня кнігі і сыстэмы мастацкага афармленьня пралетарскіх сьвят адбудзецца ў чэрвені месяцы. Гэтыя вечары будуць праводзіцца сумесна з Саюзам Савецкіх Пісьменьнікаў.

Згодна пастановы Наркамасьветы БССР 15 мастакоў з гарадоў Менску, Віцебску і Гомелю выедуць у бліжэйшы час у вытворчыя камандыроўкі.

Мастак **Керзінаў,** прыступае да работы над фігурай «Камсамолец». Мастак **Пашкевіч** будзе працаваць над калгаснай тэматыкай. Мастак **Воўкаў** выедзе для збору матар'ялаў аб жыцьці ўдарнікаў.

Работы мастакоў будуць выстаўлены на 6-й усебеларускай выстаўцы 1933 году.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

1-га чэрвеня | ГАРАДЗКІ СВД | 2-га чэрвеня

„ПРАФІНТЭРН"

Гарадзкія адборачныя на Усебеларускае сьвята спаборніцтва па княкай атлетыцы

БАРАЦЬБА, БОКС ПАДЫМАНЬНЕ ЦЯЖАРАЎ

Прымаюць удзел лепшыя цяжкія атлеты, барцы

Пасьля спаборніцтваў вялікая фізкультурная мясоўка.

Пачатак у 6 гадз. вечара.

МГСФК.

Чырв. Зорка — Каса—ад 4 г. дня. МЯДЗЬВЕДЖАЕ ВЯСЕЛЬЕ (АПОШНІ ШЭМЭТ) драма ў 7 част. з пралёгам і эпілёгам

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. 2-ая сэрыя 2-ая амэрыканскага прыгодніцкага фільму ШПАРКІ

... TO LIVE. ЖЫЦЬ

НОВЫ ГУКАВЫ мастацкі прыгодніцкі фільм

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР імя 8-га сакавіка Савецкая № 90

Новы савецкі мастацкі фільм ВЫТРЫЦЬЕ СЬЛЁЗЫ ў 6 частках

Пачатак сэансаў: Дзённых: 2, 4.30 і 6, Вечэрніх: 7 і 8-30 Каса—з 1 г. дня.

ПРАЛЕТАРЫ СІЛА І ХАРАСТВО камэдыя ў 6 частках з удзелам Пат і Паташона

СПАРТАК Выдатны мастацкі фільм ТАРАС ТРАСІЛА драма ў 7 част. Каса—з 3 г. 30 м.

На падставе пастановы прэзыдыуму Менгарсавету ад 9|V-г.г.

у мэтах уліку крыніц вадазабесьпячэньня ў горадзе ПРАПАНУЕЦЦА ЎСІМ ЖАКТАМ, УСТАНОВАМ, ПРЫВАТНЫМ ДАМАЎЛАСЬНІКАМ, на абшарах якіх знаходзяцца СТУДНІ, ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ

іх да 10|VI-33 г. у Менкамгасе (плац Волі № 2, пакой № 3).

Вінаватыя ў неыкананьні гэтага будуць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці.

МЕНКАМГАС.

Менгарком КП(б)Б і фракцыя Менгаржылсаюзу

СКЛІКАЮЦЬ

1-га ЧЭРВЕНЯ г. г.,

у 7гадз. вечара, у залі пасяджэньняў ГарКК КП(б)Б (Карла Маркса, 14)

нараду ўсіх старшынь і загадчыкаў дамамі жактаў і ЖБКТ гор. Менску—партыйцаў.

ЯЎКА АБЯЗЯКОВА.

Менгарвик КП(б)Б. Менгаржылсаюз.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ „СОЮЗОРГУЧЕТА"

з 1-га чэрвеня г. г. арганізуе групу СТАРШЫХ БУХГАЛЬТАРОЎ ДЛЯ СЫСТЭМЫ БЕЛПЛОДГАРОДНІНА

На курсы прымаюцца бухгальтары і памбухі са стажам работы па двайной бухгальтэрыі ня менш 2-х год.

Стыпендыя курсантам устанаўліваецца ад 100 да 150 руб. у месяц, апрача гэтага 25 руб. квэтарных.

Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца

Пасьля сканчэньня курсанты павінны прапрацаваць на раёне у в шэйпаказанай сыстэме на менш 2-х год.

Курсанты прымацоўваюцца да сталоўні.

Заявы з далучэньнем дакумантаў аб сасьтановішчы, сашпаходжаньні, аб рабоце бухгальтарам ці памбухам ня менш 2-х год. аб узросьце, аб адносінах да ваінсковай павіннасьці (для мужчын), аб працоўным стажы і доказу адміністрацыі ці прафуленьня калгасу аб вызваленьні з апошняга месца працы, ці вучобы,—накіраваць па адрасу: Менск, Міхайлаўская 1-4, 3-я школа, Навучальнаму Камбінату „Союзоргучета".

Пры непрадстаўленьні ўсіх пералічаных дакумантаў **заявы разглядацца ня будуць.**

Тэрмін падачы заяў да 15-га мерэня г. г.

Аб дні пачатку вучобы будзе паведамлена кожнаму залічанаму паведамленьнем на дом.

Навучальны камбінат „СОЮЗОРГУЧЕТА"

ПРАДАЕЦЦА ДОМ з аслабанепьнем кватэры з 3-х пакояў і кухні. Кальварыйская, 36.

Пастанова № 14

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў

28 мая 1933 г. *гор. Менск*

Пра парадак аднаўленьня згубленых пашпартоў

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў **пастанаўляе:**

1. Пры згубе, зьнішчэньні або пакражы пашпарту ўласьнік яго абавязан у 3-хдзённы тэрмін заявіць аб гэтым у орган РС міліцыі па месцы свайго пастаяннага жыхарства.

2. Калі згуба пашпартнага дакумэнту мела месца ў часе пераезду грамадзяніна па чыгунцы, водных, або іншых шляхох, або ў часе прабываньня не на месцы свайго пастаяннага жыхарства—заява падаецца адпаведнаму органу РС міліцыі або АДПУ па месцы выяўленьня згубы і па прыбыцьці на месца свайго пастаяннага жыхарства грамадзянін абавязан паведамиць аб згубе таксама ў орган РС міліцыі па месцы свайго пастаяннага жыхарства.

3. Грамадзяніну, які заявіў аб згубе пашпарту, орган, прыняўшы заяву пасьля апытаньня і складаньня пратаколу выдае даведку ўстаноўленага ўзору, якая павінна быць прад'яўлена грамадзянінам органу РС міліцыі па месцы яго пастаяннага жыхарства.

Даведка гэта не зьяўляецца дакумантам, які сьведчыць аб асобе грамадзяніна.

Пры атрыманьні часовага пасьведчаньня ўзамен згубленага пашпарту грамадзянін абавязан падаць заяву аб выдачы яму новага пашпарту. Гэта заява падаецца ў орган РС міліцыі па месцы пастаяннага жыхарства грамадзяніна, згубіўшага пашпарт.

4. У выпадку калі пашпарт знойдзен самім грамадзянінам, які згубіў яго, ён абавязан неадкладна заявіць у адпаведны орган міліцыі.

Нам. старшыні Менскага Гарадзкога Савету КАРАНЕЎСКІ.

За сакратара Менскага Гарадзкога Савету КЛЕБАНАЎ.

ПАСТАНОВА № 15

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў.

28 мая 1933 г. *гор. Менск.*

„Аб парадку абмену пашпартных дакумантаў пры перамене прозьвішча, імя і імя па бацьку"

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Грамадзяне, перамяніўшыя прозьвішча, імя або імя па бацьку (ва ўстаноўленым парадку або пры ўступленьні ў шлюб), абавязаны ў 3-дзённы тэрмін паведаміць аб гэтым у орган РС міліцыі і атрымаць новы пашпарт.

2. Для атрыманьня новага пашпарту асоба, перакляніўшая прозьвішча, імя і імя па бацьку абавязана прадставіць у орган РС міліцыі па месцы свайго жыхарства адпаведную даведку (пасьведчаньне) органаў ЗАГС, даведку з месца жыхарства (устаноўленага ўзору) і пашпартны дакумант.

3. За пова-выданы пашпартны дакумант увімаецца ўстаноўлены яго кошт.

Нам. старшыні Менскага Гарадзкога Савету КАРАНЕЎСКІ.

За сакратара Менскага Гарадзкога Савету КЛЕБАНАЎ.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ЧАСОПІСЬ КУЛЬТПРОПУ ЦК КП(б)Б па ніраўніцтву раённымі газэтамі, фабрычна-заводзкімі, эмтэзэбўскімі, сяўгаспымі шматтыражнымі

„БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК"

ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ У МЕСЯЦ

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і лістаносцамі.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на адзін месяц—1 руб.; тры месяцы—3 руб. да канца году—6 руб.

Выдавецтва „Зьвязда"

Згубленыя і украдзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

Прафбілеты: Шынкарэнка М. Я., Лебедзь І. С., Папоў І. Х., Праабражэнскі К. Н., Булах І. А., Кавалеўскі М. О., Манькоўскі Т. П., Жукоўскі В. Я., Караткевіч П. А., Радчук І. С., Давідовіч І. А., Рыпенка Ф. У., Нісьневіч В. І., Малочка В. Ц., Лямперт Д. Х., Корзюк І. П., Іващэнка П. Т., Вайцэшка С. Д., Акацьцеў Г. І., Баркан Ш. М., Савіцкая Т. М., Касьціцецкі С. М., Зубераў Я. Л., Важэйка В. А., Кантар Х. А., Яміцкая О., Велер М. М., Кукліцкая Н. Л., Паўлоў Д. Г., Дабрыцкі І. Ф., Шалкоўскі Г. Г., Партная Р. А., Сьвентаржыцкі І. А., Маўчан А. Я., Канэр Р. Б., Гінзбург Л. Е., Жаркевіч М. З., Івайцоў Е. Д., Вайцэхоўскі Я. В., Бараўскі К. Я., Ількевіч А. Т., Рабіновіч І. В., Наумаў В. А., Залуцкая М. А., Міньковіч М. С., Шостак Т. Ш., Самуілоў Л. Г., Вайнгаўз А. Г., Мультан М. К., Багатырава, Мытнік А. С., Шахрай В. А., Яцыно К. І., Гамеза В. Г., Шульман З. І., Кудрыцкая В. Г., Шыманская Н. М., Кудрашонак С. Ф., Драковіч П. Д., Хэйфец С. А., Гальчук І. А., Каждан Е. Е., Яцкевіч М. С., Дзядзюля Д. Р., Левін А. М., Русальскі І. В., Чабурнова О. Н., Гольдзін Е. Л., Каган Л. І., Гольдбэрг С. Е., Вайнгаря І. П., Быкова Е. А., Баўчок К. Я., Менсовіч І. А., Цымановіч О. І., Фінкель І. І., Васілец В. Г., Каплан Л. Я., Ровен А. Р., Малчан С. А., Вайнштэйн А. Д., Гейдэ К. М., Каньціна Р. В., Замах Л. П., Екельчык С. К., Астроўскі М. Я., Урублеўская Я. Я., Флакс І. А., Шпігун А. П., Кракоўская М. Л., Бродкін І. М., Мацкевіч Н. А., Пазнер К. В., Рачыцкі Ф. Н., Міхайлоўскі А., Талстой С. Д., Русанаў Л. К., Мазо І. П., Хвесько Ю. Я., Максімаў І. Г.,

Тэлефоны рэдакцыі „ЗЬВЯЗДА" Адказны рэдактар—21-358; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац. культурнага будаўніцтва—21-356; партсэктар—21-352; сэктары: прамысловы, савецкага будаўніцтва і снабжэньня насэлэрацыі і мас. каап.—21-350; транспартны сэктар і бюро расьсьледаваньня—21-355; машыннае бюро—21-351; загадчык выдавецтва і аддзел абвестак—21-359; вучотна-тыражны сэктар—21-360; кантора выдавецтва—21-385; друкарня—21-357.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.